ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ
(з дармовым дадаткам „Прафрух")

На 1 мес.	— 90 к.
„ 3 мес.	2 р. 60 к.
„ 6 мес.	5 р. —
„ 12 мес.	9 р. 75 к.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА" Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ

За радок мсіп. пасьля тэксту—60 к., іншагародніх абвесткі—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы дарожэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. -дадатку.

ЗЬВЯЗДА

Пралетары усіх краёў, злучайцеся!

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	10-74
Сакратар	6-19
Партсэктар	13-60
Сэктар інфармацыі	13-80
Начны рэдактар	6-42
Галоўная кантора	7-81
Аддзел падпіскі	7-81
» абвестак	7-81

АЎТОРАК, 6 мая 1930 г.
№ 104 (3702)
Год выданьня — XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

Беларускае бібліятэка імя Ф. Скарыны

Бальшавіцкае прывітаньне фрунзаўскай раённай партканфэрэнцыі

Да 3-й фрунзаўскай райпартканфэрэнцыі

Год, які прайшоў ад 2-й канфэрэнцыі, вызначаецца годам вялізарнейшых перамог партыі на фронце сацыялістычнага будаўніцтва.

Партыя дасягнула вялікіх посьпехаў у барацьбе супроць правай апазыцыі, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, супроць рэштак контр-рэвалюцыйнага троцкізму і «левых» загібчыкаў. Фрунзаўская арганізацыя ў барацьбе за генеральную лінію партыі выявіла сваю бальшавіцкую вытрыманасьць, сваю баяздольнасьць, сваю рашучую гатоўнасьць і ўменьне змагацца на два фронты.

Фрунзаўская арганізацыя рашуча выкрыла рад фактаў правай практыкі, заваставшы на іх увагу партыйнай і беспартыйнай рабочай масы раёну (справа Белдзяржстраху, Менакрфа, справа газэты «Рабочий», асобныя факты на справе Наркамасьветы і Наркамзему).

Надзвычай вялікую ўвагу аддавала раённая арганізацыя барацьбе за ленінскую лінію ў нацыянальнасьці. З усёй сілаю змагаючыся са ўсімі відамі шавінізму (яўрэйскага, польскага, вялікарасійскага), змагаючыся за практычнае правядзеньне беларусізацыі, мы асабліва націснулі на барацьбу з беларускім нацыянал-дэмакратызмам, як з найбольшаю небясьпекаю на даным этапе. У нашых умовах, пры моцным абвастраньні клясавай барацьбы ў краі, Фрунзаўская арганізацыя, як і ўся КП(б)Б, над кіраўніцтвам свайго ЦК, правяла свячасова барацьбу з усімі вылазкамі нацыянал-дэмакратаў і нацыянал-апартуністых унутры і па-за партыяй (тэатральная дыскусія, справа Жылуновіча, справа 3-х пісьменьнікаў, справа Зарэцкага, пяцігодзьдзе Белдзяржвыдавецтва, аб правым ухіле тав. Чарвякова і інш.). На некаторых фактах Фрунзаўская арганізацыя зьявілася заострэльшчыцаю, падняўшы на прынцыповую палітычную вышыню ацэнку такіх нацыянал-дэмакратычных вылазак, якія мелі месца пры чыстцы Жылуновіча, пры сьвяткаваньні юбілею Белдзяржвыдавецтва і інш.

Ці ўсё тут рабілася дастаткова шпарка, гібка і добра? Бязумоўна, не.

Райком не дагледзеў свячасова за работаю акрфа, дзе былі дапушчаны пэўныя скрыўленьні партыйнай, клясавай лініі. У сваёй арганізацыі былі выдзелены адзіночкі, асобныя вузельні — выхадцы з дробнай буржуазіі, зьвязаныя з дробна-буржуазным асяродзьдзем, якія найбольш лёгка паддаваліся і паддаюцца дробна-буржуазнаму ўплыву.

Канфэрэнцыя, якая адбываецца ў пасле падрыхтоўкі да XVI партыйнага з'езду ВсесКП(б), павінна ўважліва ўлічыць ажыцьцяленьне праваўхілісцкіх элементаў, якое назіраецца ўнутры нашай партыі. Уся актыўнасьць партыйнай арганізацыі павінна быць мабілізавана на барацьбу з правым ухілам, як найбольшай небясьпекаю, а таксама супроць «левых» загібчыкаў і прымірэнцтва да іх.

Барацьба за высокія тэмпы разьвіцьця прамысловасьці, за выкананьне прамфінпляну поўнасьцю і ў тэрмін, разгортваньне сацыябарніцтва і ўдарніцтва сталі ў цэнтры ўвагі арганізацыі. Да канфэрэнцыі Фрунзаўская арганізацыя прыходзіць з цэлым радам канкрэтных гаспадарчых дасягненьняў. Такія прадпрыемствы, як «Кастрычнік», «Мамунар», друкарня імя Сталіна, Зьвод перавыканалі свае прамфінпляны за 1928-29 год і за першае паўгодзьдзе 1929-30 году, на галоўных колькасных і якасных паказальніках. На гэтых прадпрыемствах мы маем вялізны ўдзьм палітычнай актыўнасьці рабочых, які стрымаў сваё асаблівае выяўленьне ў разгортваньні сацыялістычнага спаборніцтва, якім ахоплена да 90-100 проц. рабочых.

Вынікі 1-га паўгодзьдзя ўсё-ж паказваюць на значнай групе прадпрыемстваў вялікія прарывы ў выкананьні прамфінпляну. Асабліва адзначаюць галянтарэйная фабрыка «Беларуска» (76 проц.), «Дрэвапрацоўнічык» (96 проц.), «Чырвоны Тэкстыльшчык» (76 проц.), футравая фабрыка (91 проц.) і г. д. Аналіз прычын гэтых недахопаў гаворыць за тое, што большая частка ячек не павярнулася на справе тварам да вытворчасьці, ня стала сапраўды на чале мас, ня здолела накіраваць узрастаючую актыўнасьць рабочых на барацьбу за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну.

Канфэрэнцыя павінна гэта в усёй рашучасьцю падкрэсьліць в тым, каб на зьнішчэньне гэтых недахопаў мабілізаваць усю ўвагу арганізацыі. Прамфінпляны прадпрыемстваў поўнасьцю рэальны, яны павінны быць выкананы. Гэтым мы забясьпечым ажыцьцяўленьне на практыцы генэральнай лініі партыі і гэтым мы забясьпечым выкананьне пяцігодкі за чатыры гады.

Паварот сераднякоў да калгасаў, калгасны рух, які шырока разгарнуўся, сацыяльная калектывізацыя і на ім базе ліквідацыя кулацтва, як клясы — паставілі перад арганізацыяй з усёй сур'ёзнасьцю задачу папаўненьня вёскі вытрымаными пралетарамі, здольнымі паесьці бядняцка-серадняцкія масы па сацыялістычным шляху разьвіцьця сельскае гаспадаркі. Фрунзаўскі райком паслаў 100 рабочых у лік «25.000», паслаў 31 рабочую брыгаду для арганізацыі веснавой пасеўнай кампаніі і калектывізацыі вёскі.

Посьпехі калгаснага руху, выклікаўшыя галавакружэньне ў раду практычных работнікаў у асобных зьвеньнях нашае партыі, кулацкі націск на апошніх, прывялі да скрыўленьня лініі партыі, да «левых» перагібаў, якія выявілі свой антысерадняцкі характар і якія зьявіліся асноўным формазам у разьвіцьці калектывізацыі.

Фрунзаўскі райком таксама дапусьціў у гэтых адносінах пэўныя палітычныя памылкі ў тым іменна, што ён пастанавіў да канца 1930 году калектывізаваць прыгарадныя сельсаветы, што ён слаба інструктаваў і правяраў працу сваіх рабочых брыгад, ня прыняўшы свячасова мер да барацьбы з тымі перагібамі, якія былі таксама дапушчаны некаторымі брыгадамі ў іх практычнай рабоце.

Райком свячасова прыступіў да растлумачэньня дырэктыў партыі — артыкулу т. Сталіна аб клясавай шкодзьнасьці і сутнасьці «левых» перагібаў, узяўшыся за неадкладнае выпраўленьне сваіх памылак. Але гэта зусім ня значыць што тут усё зроблена. У гэтай галіне перад арганізацыяй стаяць вялікай важнасьці задачы. Агульны ўздым палітычнай актыўнасьці, які пераважная часткаю арганізацый быў правільна скарыстаны, паляпшэньне пастаноўкі работы партыі ў масах, рознастайнасьць форм масавай работы далі значныя плады нашай арганізацыі.

Фрунзаўская арганізацыя прыходзіць у выніку гэтага да канфэрэнцыі са значным новым папаўненьнем за кошт старых рабочых. Арганізацыя вырасла за 11 месяцаў на 800 рабочых. Сацыяльны твар арганізацыі зьмяніўся такім чынам: рабочых па сацыяльным становішчы—70 проц., рабочых ад станка—51 проц. Да канфэрэнцыі арганізацыя прыходзіць пасьля генэральнай праверкі радоў партыі, ачысьціўшыся ад усяго чужога, расклаўшагася, бальшавіцкі няўстойлівага — гэта прыдае вялікую моц і маналітнасьць нашай арганізацыі.

Няма сумненьняў, што Фрунзаўская арганізацыя, якая паказала на радзе важнейшых карэнных пытаньняў правядзеньня лініі і дырэктыў партыі сваю баяздольнасьць, сваю бальшавіцкую вытрымаласьць, на сваёй 3-й канфэрэнцыі здолее на аснове самай шырокай самакрытыкі праверыць сваю работу, выкрыць усе свае недахопы і па-бальшавіцку мабілізавацца на выразнае практычнае правядзеньне генэральнай лініі партыі, на самую рашучую барацьбу супроць правага ўхілу — галоўнай небясьпекі і «левых» загібаў, якія ствараюць глебу для правых.

Гр. ШПЭКТАРАЎ.

Аб'яднаны пленум Менскага АК і АКК КП(б)Б

Аб выніках чысткі акрпартарганізацыі

З дакладу т. Дамброўскага

— Толькі дзякуючы вялізарнаму падыму ініцыятыўнасьці шырокіх рабочых, батрацкіх і бядняцка-серадняцкіх мас, — сказаў т. Дамброўскі,—і згуртаваньню гэтае актыўнасьці вакол пытаньняў генэральнай чысткі партыі мы здолелі посьпехам выканаць задачы праверкі чысткі партыйных радоў.

Перад чысткай партарганізацыі была праведзена шырокая растлумачальна-падрыхтоўчая работа. Праведзеная падрыхтоўчая работа, добры падбор праверкомаў, выстарчальнае кіраўніцтва іх работай з боку АК, АКК і РК забясьпечылі правядзеньне чысткі над кутом праверкі выкананьня палітычных задач партыі. Шырокія партыйныя і беспартыйныя масы правільна ўсьвядомілі задачы і мэты чысткі і дапамаглі партыі ачысьціцца ад некамуністычных, клясава-варожых і чужых элементаў.

У часе чысткі вясковае партарганізацыі батрацка-бядняцкія масы сялянства дапамаглі праверкомам праверыць ня толькі здольнасьць кожнага асобнага камуніста змагацца за генэральную лінію партыі, але і шырока праверыць работу кожнай вясковай парт'ячэйкі, праверыць наколькі яна кіруе калгасным будаўніцтвам.

Чыстка ў вайсковай арганізацыі зьняла зацікаўленасьць чырвоناармейцаў да баявой падрыхтоўкі, замацавала іх, павысіла аўтарытэт начальніцкага складу і вачох чырвонаармейскіх мас і паслужыла пераломам у разгортваньні шырокай бальшавіцкай самакрытыкі.

Потым т. Дамброўскі спыняецца на выніках чысткі вытворчых ячэек. Акцыўнасьць рабочых мас у часе чысткі вытворчых ячэек была накіравана на праверку ўдзелу камуністых у выкананьні прамфінпляну, удзелу ва ўдарных брыгадах і сац. спаборніцтве. Была шырока праверана работа ячэек на вярбоўцы рабочых у рады партыі.

У выніку шырокага разгортваньня самакрытыкі, дакладнай праверкі работы ячэек у часе чысткі мы мелі вялікі ўплыў у партыю за лік перадавых рабочых, батракоў і бяднякоў.

На акрузе праверана 310 ячэек, якія аб'яднаюць 11.145 членаў і кандыдатаў партыі. Пэрсанальную праверку па арганізацыі прайшло 8.250 членаў і 2.895 кандыдатаў партыі. З ліку правераных выключаны з партыі: па вясковых ячэйках—330, што складае 15 проц. складу вясковай партарганізацыі, па савецкіх ячэйках—152 члены і кандыдаты партыі ці 12 проц. складу савецкіх ячэек; па вытворчых ячэйках—237 чал. ці 6,1 проц.; па вузаўскіх ячэйках—76 чал., ці 9,3 проц.; па вайсковых—118 ці 5,4 проц. Усяго ў выніку чысткі з партыі выключана 1.012 чал., што складае 9 проц. складу акрпартарганізацыі. Найбольшы процант выключаных складаюць кандыдаты партыі.

Па сацыяльным становішчы выключаныя падзяляюцца так: рабочых—386 ці 5,8 проц., сялян—282 ці 11,4 проц., служачых і інш.—344 ці 16,7 проц.

У выніку чысткі ўдзельная вага рабочых у арганізацыі ўзрасла на 2 проц. у той час, як зьнізілася ўдзельная вага служачых на 1,6 проц. Акрамя гэтага, у часе чысткі ў партыю рабочымі было падана звыш 2.000 заяў.

За розныя антыпартыйныя ўчынкі і злачынствы (скажэньні клясавай лініі і інш.), наложана партспагнаньняў на 25 проц. складу партарганізацыі.

У заключэньне т. Дамброўскі адзначыў, што да гэтага часу ў партарганізацыі няма рашучага пералому ў выкананьні прапаноў праверкомаў. Трэба будзе вылучаць спэцыяльныя брыгады для праверкі выкананьня прапаноў праверкомаў. Мы будзем сурова караць тых, хто так ці інакш сабатуе або не жадае выконваць пастановы праверачных камісій.

У спрэчках па дакладу т. Дамброўскага выказалася 9 чалавек. Т. т. падкрэсьлілі вялікую работу, праведзеную АКК пры дапамозе партарганізацыі.

Тав. Андрыянаў падкрэсьліў, што некаторыя ячэйкі ўпарта ўхіляюцца ад правядзеньня ў жыцьцё прапаноў праверкомаў і тым самым ня выпраўляюць памылак і асобных прамахаў, якія мелі месца ў іх рабоце. Па гэтым-жа пытаньні ў спрэчках выступалі т. т. Конюхаў, Жуковіч, Куран, Готліб і інш.

На барацьбу за прамфінплян

Хто зрывае работу Бабруйскага камбінату

Бабруйскае аддзяленьне Лесбелу нядбайна адносіцца да сплаву

100.000 руб. страт па віне галавацяпаў

Дрэнная якасьць сплаву прыносіць Бабруйскаму камбінату значныя страты. Лішняя работа па перасартаваньні лесу падаражае себекошт прадукцыі.

Для больш падрабязнага азнаямленьня з работай сплаўных вучасткаў выяжджала брыгада з прадстаўнікоў «Зьвязды», камбінацкай газэты «Пралетарская Піла» і рабочых. Брыгада агледзела рад прыстаняй і выявіла многа недарэчнасьцяй.

Як правіла, нідзе сплаўны лес не сартуецца. Лес вяжацца і сплаўляецца, як трапіла, абы з рук збыць. Між тым, магчымасьці для сартаваньня ў большасьці прыстаняй ёсьць.

На прыстані «Зьмібўка» ня толькі зазыні аб сартаваньні, але нават не аддзяляюць адну пароду лесу ад другой. У сплаве можна ўбачыць побач і сасну, і елку, і алешыну. Вязка сплаву нікуды нявартая. Дзесятнік Мэрголін, спасылаючыся на «аб'ектыўныя» прычыны, лічыць гэтыя зьявішчы нармальнымі.

Распрацоўка лесу, які знаходзіцца на прыстані Масьціўча, дрэнная. Лес перамешан ня толькі па гатунках, але нават і па пародах. Сплавам на гэтым вучастку кіруе Рыбакоў, якога прагналі з камбінату і аддалі пад суд за зрыў работы на камбінаце.

На прыстані «Чуча» рабочыя самі бегаюць па полі, рвуць лазу і вяжуць грабёнкі. На прыстані ёсьць алешына, разьмерам ад 4-х да 12 мэтраў. Распрацавана яна вельмі дрэнна — крывая або зусім скручаная. ТАНІ ЛЕС ПРЫ ВЫКАЧЦЫ МОЖА ПАЛАМАЦЬ КАМБІНАЦКІЯ САМАТАСЫ. У грабёнках, якія вязаліся на гэтай прыстані, можна знайсьці лес 20-ці разьмераў.

Лес, падрыхтаваны на прыстані «Двары», [illegible] сплаву, зусім нягодны, увесь у сучках. Тані [illegible] пакрышае брак і сабекошт.

Абураючае становішча брыгада выявіла на прыстані «Цыганка». 50 проц. сплаўнага лесу па сваёй апрацоўцы ні ў якім разе на можа быць прыняты для расьпілоўкі. Хвойныя пароды перамешаны з ліственымі. Сартаваньня няма. Дзесятнік Кісын на прыстані бывае рэдка. Работай кіруе старшы арцелі, які імкнецца хутчэй збыць матар'ял з рук.

Брыгада прымушана была зрабіць вывад, што работнікі сплаву, прыкрываючыся аб'ектыўнымі прычынамі, вельмі нядбайна адносяцца да работы. Такая работа пагражае зрывам выкананьня прамфінпляну камбінату. Загатоўчыя арганізацыі зусім слаба кіруюць работай на сплаўных прыстанях.

Брыгада прапануе: камбінат павінен узяць на сябе пастаянны кантроль над работай сплаўных прыстаняй і прымусіць аддзяленьне Лесбелу кіраваць сплаўнымі работамі ў адпаведнасьці з вытворчымі патрэбнасьцямі камбінату. Адпаведныя органы таксама павінны зацікавіцца якасьцю сплаву.

Трэба адзначыць, што пры сартаваньні матар'ялу хацяк-ка на 75 проц., камбінат з'эканоміў-бы каля 100.000 руб. у год.

Брыгадзіры:
А. МАГІДАЎ, ДЗЕЛЯНДОЎ, КАЦНЭЛЬСОН і КАНЮШЭНКА.

„Энэргія" на пераломе

ЗА КРАСАВІК ПРАГРАМА ПЕРАВЫКАНАНА

Як вядома, за першае паўгодзьдзе завод «Энэргія» выканаў вытворчую праграму на 94,92 проц. За апошнія месяцы ў рабоце заводу наглядаецца пералом. За красавік вытворчая праграма выканана на 102,64 проц. Калі ўзяць па цэхах, то на першым месяцы ідзе вагавы цэх, які за красавік выканаў вытворчую праграму на 123,99 проц., а за першыя 7 месяцаў выканаў сваю праграму на 101,66 проц. Гэта выразна гаворыць аб зусім рэальнай магчымасьці ня толькі ліквідаваць прарывы, але і перавыканаць вытворчую праграму.

Адстаюць механічна-кацёльны і ліцейны цэхі.

Але за першыя 7 месяцаў завод выканаў вытворчую праграму ўсяго на 96,23 проц. Гэта павінна мабілізаваць увесь калектыў «Энэргіі» на далейшую ўдарную барацьбу за выкананьне прамфінпляну.

Калі ёсьць пералом у выкананьні вытворчай праграмы, дык няма яшчэ ніякага пералому ў паляпшэньні кіраўніцтва і масавай работы. Партыйная і прафэсыянальная арганізацыі перабудавалі сваю работу фармальна і да гэтага часу яшчэ ня сталі тварам да вытворчасьці. Ня толькі рабочыя, нават майстры ня ведаюць, што ім рабіць. Ліцьцё за красавік месяц ужо зроблена, а майскае яшчэ не пачата.

Інжынэрна-тэхнічныя работнікі на заводзе мала цікавяцца вытворчасьцю. Інжынэрна-тэхнічная сэкцыя не дапамагае ўдарніцтву і сама не працуе ўдарна. На тэхнічнай нарадзе выявілася, што тэхнік т. Вайнштэйн нават ня ведае, дзе знаходзіцца вузьня, ня гледзячы на тое, што ён працуе на заводзе шмат часу. ІТС ніяк ня можа наладзіць тэхнічную кансультацыю для рабочых, не праводзіць гутарак па цэхах, ня выконвае узятых на сябе абавязкаў па сацдагаворы. 15-га сакавіка на тэхнічнай нарадзе была ўхвалена пастанова аб тым, каб тэхнэрсанал узяў на сябе кіраўніцтва ўдарнымі брыгадамі. Прадстаўніку ІТР даручана было распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы. Але да гэтага часу нічога ня рушана з месца. Пастанова засталася на паперы.

Прадстаўнікі ЦПСПБ, якія прымацаваны да заводу для ўдзелу ў праверцы выкананьня сацдагавору, тыднямі ня бываюць на заводзе.

Брыгадзіры «Зьвязды»
БРАЙНІН, ПАЛІЧАНСКІ.

Гута „Працы" зьніжае тэмп

Папярэдзіць прарыў

У Шклатрэсьце няма яшчэ вестак аб выкананьні прамфінпляну за красавік ад усіх заводаў. Ёсьць весткі ад асобных гут за дадзе дэкады. Статыстык Шклатрэсту тав. Анішкевіч на просьбу паказаць дэкадныя зводкі, адказаў:

— Навошта вам дэкадныя зводкі? Прарываў у нас няма. Шклапрамысловасьць не зьяўляецца паказальнай.

Але сьціплась статыстыка не гаран туе ад прарываў.

Полацкая гута «Працы» за першыя дзьве дэкады выканала вытворчую праграму ўсяго толькі на 61,6 проц., г. зн. недавыканала праграму на 4,4 проц.

Лепш працавалі іншыя гуты. Гута «Ільіч» выканала вытворчую праграму на 76,3 проц. месячнага заданьня. Гута «Камінтэрн»—на 87,5 проц., гута імя Домбаля—на 69,1 проц., гута «Пралетары»—на 67,2.

Ад гут «Ноўка» і «Кастрычнік» няма яшчэ вестак.

А. М.

Актысавецкая правакацыя амэрыканскай паліцыі

НА СЦЭНЕ ЗНОЎ ФАЛЬШЫЎКІ

Сусьветная рэакцыя імкнецца да падрыву савецка-амэрыканскіх гандлёвых адносін

НЬЮ-ЁРК, 4. Начальнік нью-ёркскай паліцыі Уолен перадаў у друк для апублікаваньня здымкі з лістоў фальшывак, якія навінны давесьці, што Амторг, АДПУ і савецкі ўрад, у прыватнасьці, Сквірскі (загадчык савецкім інфармацыйным бюро ў Вашынгтоне) непасрэдна нясуць адказнасьць за дзейнасьць камуністых у Злучаных Штатах. Адна з гэтых фальшывак, напісаная нібы на бланку Амторгу была паслана, быццам прадстаўніку Амторгу ў Маскве з копія лісту ў Камінтэрн. Уолен падкрэсьлівае, што, як відаць з лістоў, у распараджэньні Сквірскага знаходзяцца сумы для фінансаваньня Амторга і сэкцыі АДПУ. Уолен заяўляе, што АДПУ мае свае аддзяленьні ва ўсіх краёх.

Зьмест аднэй фальшыўкі заключаецца ў наступным: ліст паведамляе нейкага Графэна, што «Выканкомы Камінтэрну і Прафінтэрну загадваюць яму зноў адправіцца ў Злучаныя Штаты ў якасьці генэральнага прадстаўніка гэтых арганізацый з тым, каб арганізаваць штаб у Сіэтлі і распачаць нелегальную работу».

Другі ліст, адрасаваны «дарагому таварышу Саулу» таксама памечан Выканкомам Камінтэрну і загадвае Саулу перадаць кропы «таварышу Лізе» для разьмеркаваньня сярод тэкстыльшчыкаў, гарнякоў і механічнікоў. Спачатку Уолен даў газэтам інструкцыі апублікаваць дакументы 12-га мая, але ў сувязі са значнымі разьмерамі першамайскай дэманстрацыі ў Нью-Ёрку — тэлеграфаваў газэтам, каб яны апублікавалі дакументы 2-га мая.

Старшыня Амторгу т. Багданаў зьвярнуўся да Уолена з лістом, у якім катэгарычна заяўляе, што апублікаваныя ў друку дакументы зьяўляюцца абсалютнай падробкай. «Ад імя Амторгу прашу дакладна расьсьледаваць справу аб дакумантах. Амторг гатоў аказаць сваю дапамогу гэтаму расьсьледаваньню. Дзейнасьць Амторгу з моманту яго стварэньня ў 1924 годзе заўсёды мела чыста гандлёвы характар».

Падкрэсьліваючы буйныя разьмеры савецка - амэрыканскага гандлю, — крэдытаў, прадастаўленых Амторгу, тав. Багданаў піша: «Апублікаваньне ў друку вашай заявы і фатаграфічных здымкаў з тых дакумантаў, якія зьяўляюцца фальшыўкамі, можа напесьці значныя страты нам і шматлікім амэрыканскім фірмам, з якімі мы вядзем гандлёвыя справы».

Усе газэты на відным месцы публікуюць фальшывыя дакументы. Паводле паведамленьня з Вашынгтону, загадчык савецкім інфармацыйным бюро Сквірскі ў гутарцы з прадстаўнікамі друку зазначыў, што апублікаваныя дакументы зьяўляюцца яўнай падробкай і выказаў надзею, што ўрад арганізуе дакладнае расьсьледаваньне. Паводле слоў, Сквірскага, ён мае неафіцыйныя весткі аб тым, што фальшыўкі зроблены з мэтай падрыву савецка - амэрыканскіх адносін.

ЦК кампартыі ПАЗШ апублікаваў заяву, у якой гаворыць, што дакументы прадстаўляюць сабой глупыя, злачынныя фальшыўкі. Кампартыя ПАЗШ ня ведае тайных агентаў Камінтэрну, або якой-небудзь савецкай арганізацыі.

Бессаромнай хлусьней зьяўляецца цьверджаньне аб атрыманьні кампартыяй або камуністычным друкам субсыдый, у якой-бы там ні было форме, або з якой-небудзь крыніцы, паказанай ў дакумантах. Далей у заяве ЦК паказваецца што фабрыканты фальшывак нарабілі памылак у загалоўках на бланках лістоў, паколькі «амэрыканскай сэкцыі выканкому Камінтэрну» ня існуе, роўна, як ня існуе Фэдэрава які нібы напісаў дакументы. Толькі нянісьменны белагвардзеец можа ня ведаць, што кіраўніцтва амэрыканскай сэкцыяй Камінтэрну ажыцьцяўляецца ЦК кампартыі ПАЗШ, а такіх установ, як «амэрыканскі камітэт кампартыі» наогул ня існуе. Заява ЦК падкрэсьлівае, што дакументы выкрываюць пяведаньне аўтарамі іх эканамічных умоў Амэрыкі.

Далей у заяве «зазначэцца, што Камінтэрн і Прафінтэрн ніколі не выдаюць разам мандатаў. У заключэньне зазначаецца, што апублікаваньне дакумантаў прадстаўляе сабой частку антысавецкай кампаніі.

Заява міністэрства замежных спраў ПАЗШ

НЬЮ-ЁРК, 4. Дзяржаўны дэпартамант (міністэрства замежных спраў) апублікаваў наступную заяву: «Дэпартамант ня мае вестак аб тым, каб Амторг прымаў удзел у якой-небудзь прапагандыстцкай дзейнасьці ў Злучаных Штатах». Міністэрства юстыцыі апублікавала аналягічную заяву.

«Нью-Ёрк Таймс» піша, што апублікаваныя дакументы нагадваюць ліст «Зіноўева». У той час, як большасьць газэт апублікавала гісторыю з фальшыўкамі падрабязна, дадаўшы тэксты «дакумантаў» «Джорналь оф Комэрс» прысьвяціў усёй гісторыі 23 радкі на апошняй старонцы, прычым у гэтых 23 радках больш за ўсё месца ўдзелена абвяржэньню Багданава. «Уолстрыт Джорналь» зусім не апублікаваў гісторыі з фальшыўкамі. «Нью-Ёрк Уорлд» публікуе «дакументы», а таксама абвяржэньне Сквірскага, Багданава і Кампартыі. Газэта пры гэтым адзначае: «Пры бліжэйшым разглядзе дакументы маюць у сабе супярэчнасьці, якія могуць выклікаць сумненьні ў іх сапраўднасьці. (ТАСС).

Ангельскія цьвёрдалобыя падтрымліваюць сваіх амэрыканскіх братоў

ЛЁНДАН, 4. Друк шырока публікуе нью-ёркскую гісторыю «аб маскоўскай змове» ў сувязі з апублікаваньнем фальшывых дакумантаў начальнікам нью-ёркскай паліцыі Уоленам. Кансэрватыўны друк безагаворачна прыняс сапраўднасьць дакумантаў.

Ліберальны друк і орган рабочай партыі «Дэйлі Гэральд» займаюць крытычную пазыцыю. (ТАСС).

Важнае прызнаньне

РЫГА, 30. Газэта «Пэдэя Брыдзі» піша: «Апошнія падзеі ў Варшаве выклікалі ў прэсе жывое абмеркаваньне пытаньня аб супярэчнасьцях паміж Польшчай і Савецкай Расіяй і магчымасьці канфлікту ў будучым. Наш супрацоўнік у сувязі з гэтым зьвярнуўся да начальніка штабу арміі генэрала Калейса, ён заявіў:

«Ня думаю, каб у сучасны момант пагражала небясьпека савецка-польскай вайны. У такой вайне я ня бачу неабходнасьці. Калі ўсё-ж вайна выбухне, і ў гэту вайну будзе ўцягнута Польшча і магчыма таксама Эстонія, то, зразумела, мы ня зможам не рэагаваць на гэты факт. Што нам прышлося-бы канкрэтна рабіць, гаварыць аб гэтым рана, бо патрэбныя крокі заўсёды прымаюцца ў залежнасьці ад становішча, якое ствараецца».

***

Гэта досыць аўтарытэтная заява начальніка штаба латвійскай арміі сьведчыць аб наяўнасьці паміж польскім і эстонскім генштабамі сакрэтнага дагавору, накіраванага супроць СССР. Гэта заява пацьвярджае таксама інфармацыю, якая ў свой час зьявілася ў друку ў радзе краёў аб тым, што нядаўняя паездка главы эстонскай дзяржавы Штрандмана ў Варшаву была выкарыстана для ўстанаўленьня цеснага ваеннага супрацоўніцтва паміж абедзьма дзяржавамі. («Известия»).

Паўстанцкі рух у Пэшавары пашыраецца

ЛЁНДАН, 4. У раёне Пэшавара паўстанцкі рух ня спыняецца. З прычыны адсутнасьці пэўных вестак, хваляваньне сярод буржуазных колаў узрастае. Бамбэйская фондавая біржа закрылася. Ва ўсіх гарадох Пэнджаба абвешчаны «хартал» (жалобны дзень). «Дзень мусульманскай Пэшавара» адзначан у Лагоры і Амрыцары закрыцьцём крам, рынкаў, школ, спыненьнем работы мясцовага транспарту. Адбыліся дэманстрацыі добраахвотнікаў. У Амрыцары арыштавана 25 чал.

У Калькуце адбылася сутычка паміж удзельнікамі працэсіі і паліцыяй. Асацыяцыя журналістых патрабуе скасаваньня новага закону аб друку.

Толькі 17% пляну сяўбы выканана на 1-е мая

Тэмп сяўбы ў саўгасах нездавальняючы

АСНОЎНЫЯ ПРЫЧЫНЫ — АДСУТНАСЬЦЬ АРГАНІЗАЦЫІ ПРАЦЫ І ЗАНЯПАД ПРАЦДЫСЦЫПЛІНЫ

Даныя на 3 мая сьведчаць аб тым, што тэмп сяўбы ў беларускіх саўгасах нездавальняючы. Так, на гэты дзень саўгасамі засеяна ўсяго 30.764 гэкт.—23,5 проц. пляну. Саўгасы паўднёвых акруг—Мазырская і Гомельская, якія пачалі сяўбу раней за іншыя акругі, выканалі заданьне менш, чым нават больш паўночная Менская акруга.

На першым месцы — саўгасы Менчыны, якія выканалі 27,5 проц. пляну. Пасьля іх ідуць саўгасы Гомельшчыны —23,46 проц. пляну, Мазыршчыны—25,7, Вабруйшчыны—23,9 проц., Магілеўшчыны—19 проц., Віцебшчыны — 15 проц., Аршаншчыны—10,48 проц., Полаччыны—6,22 проц.

По асобных культурах малюнак такі: па канюшыне плян выкананы на 50 процантаў, аўсу—на 40 проц., па віцы —на 71,3 проц. Адстае сяўба бульбы—8,5 проц. пляну, лубіну—18,2 проц. Ніводзін саўгас яшчэ не засеяў ні аднаго гэктару ільну.

Па асобных саўгасах тэмп сяўбы адстае ня толькі ад тэмпу калгасаў, але нават і індывідуальнага сэктару. Адзначаецца наогул спазьненьне з пасевам гародніны. Далёка ня ўсе саўгасы ажыцьцяўляюць агрэмінімум.

Аднэй з асноўных прычын нездавальняючага тэмпу сяўбы ў калгасах зьяўляецца адсутнасьць належнай арганізацыі працы.

З раду саўгасаў паведамляюць аб абураючых фактах заняпаду працоўнай дысцыпліны (саўгас імя Леніна, Шыкатавічы, Апоцаль, Какорычы, Грудзінаўка і інш.).

15-га мая павінна ўжо скончыцца сяўба ў Гомельшчыне і Мазыршчыне, а ў рэшце округ ад 20 да 25 мая. Калі, аднак, Белсельтрэст і незалежныя прафсаюзныя органы ня прымуць тэрміновых мер да арганізацыі працы і ўзьняцьця працоўнай дысцыпліны ў саўгасах, дык наўрад ці скончыцца ў саўгасах сяўба ў тэрмін.

С. Г.

ХОД СЯЎБЫ ПА БССР

Апэрацыйная зводка на 30-га красавіка*)

ПА БССР ПА ЎСІХ КУЛЬТУРАХ ЗАСЕЯНА 320.172 ГЭКТ., ШТО СКЛАДАЕ 17 ПРОЦ. ПЛЯНУ.

У МЕНСКАЙ акрузе (па 12 раёнах) ЗАСЕЯНА ЗВЫШ 15 проц., у тым ліку па калгасах 20 проц. і па індывідуальным сэктары каля 14 проц.

У МАЗЫРСКАЙ акрузе засеяна каля 34 проц., у тым ліку па калгасах 40 проц. і па індывідуальным—33 проц.

У БАБРУЙСКАЙ акрузе засеяна каля 25 проц., у тым ліку па калгасах 31 проц. і па індывідуальным сэктары—24 проц.

У ПОЛАЦКАЙ акрузе засеяна каля 8 проц., у тым ліку па калгасах 16 проц. і па індывідуальным сэктары—5 проц.

У МАГІЛЕЎСКАЙ акрузе ўсяго засеяна 16 проц., у тым ліку па калгасах 17 проц., па індывідуальным сэктары —15 проц. У ГОМЕЛЬСКАЙ акрузе засеяна 22 проц., у тым ліку па калгасах 36 проц., па індывідуальным сэктары—18 проц. У ВІЦЕБСКАЙ акрузе ўсяго засеяна 3 проц.

*) Зводка даецца без Аршанскай акругі, адкуль вестак не паступіла. Падрабязныя весткі аб ходзе сяўбы будуць даны заўтра.

Апошняя пяціднёўка яшчэ не дала пераломy

МАГІЛЕЎ. (Па тэлефону ад нашага карэспандэнта).

Апошняя пяціднёўка яшчэ ня дала патрэбнага пералому ў тэмпе сяўбы па Магілеўшчыне. Калгасамі на 1-га мая засеяна 19 проц. свайго яравога кліну. Індывідуальнікі засеялі толькі 16 проц.

Праўда, па некаторых раёнах за апошнія 5 дзён наступіў некаторы зрух. У Быхаўскім раёне калгасы ўжо засеялі 26 проц. яравога кліну, раней было толькі 10 проц., індывідуальнікі засеялі 16 проц., раней было 9. У Кармянскім раёне за 5 дзён засеяна 11 проц. яравога кліну. Усяго засеяна 23 проц.

У перадзе, як і раней ідзе, Клімавіцкі раён, дзе калгасы ўжо засеялі 30 проц., а індывідуальнікі 24 проц. яравога кліну. Ганцэвіна адстае Журавіцкі раён, які за апошнія 5 дзён засеяў усяго 1 проц. яравога кліну.

У іншых раёнах засеяна ад 15 да 22 проц. яравога кліну.

Пастанова СНК БССР

АБ ХОДЗЕ ПАСЕЎНАЙ КАМПАНІІ І КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ

Заслухаўшы даклад упоўнаважанага Савету Народных Камісараў БССР па правядзеньні вытворчай с.-г. кампаніі 1930 г. аб ходзе засеву і калектывізацыі, Савет Народных Камісараў БССР адзначае:

1. Разгортваньне сяўбы ў большасьці раёнаў праходзіць нездаваль

На спробы дыскрэдытацыі партыйнага кіраўніцтва—шчыльней рады вакол Ленінскага ЦК УсеКП(б)

За генэральную лінію партыі, за бальшавіцкае кіраўніцтва ЦК КП(б)Б, супроць правага ўхілу і „левых“ загібшчыкаў, якія дапамагаюць правым капітулянтам

„Дыскрэдытацыя парткіраўніцтва ёсьць тая самая элемэнтарная глеба, на базе якой толькі і можа разыграцца змаганьне правых ухілістаў супроць партыі. Гэту глебу даюць правым ухілістым „левыя“ загібшчыкі, памылкі і скрыўленьні“ **(СТАЛІН)**

ЗА ГЕНЭРАЛЬНУЮ ЛІНІЮ

Партыя разгарнула рашучую барацьбу з «левымі» памылкамі і скрыўленьнямі, якія зьяўляюцца зараз «асноўным тормазам далейшага росту калгаснага руху і простай дапамогай нашым клясавым ворагам» (пастанова ЦК). У сувязі з гэтым, асобныя таварышы правыя даводзяць, што «правы ўхіл на ёсьць ужо галоўная небясьпека». Няма нічога больш шкоднага за гэтыя «тэорыйкі», якія граюць на руку праваму ўхілу, змазваюць характар правай небясьпекі, якая застаецца галоўнай небясьпекай па даным этапе.

Партыя будзе з бальшавіцкай непрымірымасьцю выкрываць усялякую спробу, адкуль-бы яна ні зыходзіла, ацэньваць барацьбу з «левымі» загібшчыкамі, як «прымірэньне» з правым ухілам, з якім партыя ня спыніе змагацца, як з галоўнай небясьпекай.

«Асаблівасьць перажыванага моманту заключаецца ў тым, што барацьба з памылкамі «левых» загібшчыкаў зьяўляецца ў нас умовай і своеасаблівай формай пасьпяховай барацьбы з правым апартунізмам» (І. Сталін). Вось чаму партыя, узмацняючы барацьбу з правым ухілам — галоўнай небясьпекай, рашуча ўдарае па «левых» загібшчыках — саюзьніках правых.

Паколькі «левыя» перагібы і скрыўленьні тармозяць калгасны рух, паколькі яны льлюць ваду на млын кулацтва, узмацняюць супраціўленьне дробна-буржуазнай стыхіі, — пастолькі яны [illegible] глебу для [illegible] правапартуністычных [illegible] у радох партыі. Памылкі і скрыўленьні «левых» загібшчыкаў даюць повад правым апартуністам для новых атак супроць генэральнай лініі партыі.

Зараз, між іншым, дзе-ні-дзе чутны галасы, што паміж правым і «левым» апартунізмам няма ніякай розьніцы. Так меркаваць шкодна і небясьпечна. Нельга не заўважаць спэцыфічных асаблівасьцяй правага і «левага» апартунізму. Неабходнай якасьцю бальшавіцкай тактыкі ў барацьбе за лінію партыі зьяўляецца здольнасьць як выразна адрозніваць асаблівасьці правага і «левага» апартунізму, так і бачыць іх пэўныя агульныя рысы.

Усё гэта павінен цьвёрда ўсьвядоміць кожны камуністы, кожная партыйная ячэйка. Партыйныя арганізацыі, разгортваючы самую шырокую бальшавіцкую самакрытыку, павінны ўзмацніць сваю клясавую пільнасьць. Тым больш, што зараз мы заўважаем актывізацыю правапартуністычных элемэнтаў, повадам для якое паслужылі памылкі і скрыўленьні «левых» загібшчыкаў.

Правыя (і «левыя») не ад таго, каб спэкульнуць на памылках і перагібах, дапушчаных у асобных мясцох, і набыць сабе на гэтым які-небудзь капіталец. Калі правыя зараз в вучоным выглядам заяўляюць, што «мы мелі рацыю, нашы прагнозы апраўдаліся», дык «левакі» в няменшай актыўнаосьці енчаць аб «адступленьні». Канчатковая мэта ўсіх гэтых манэўраў зусім ясная — дыскрэдытаваць генэральную лінію партыі і ня бальшавіцкае кіраўніцтва. Часамі маюць месца адкрытыя спробы апартуністых перакласьці сваю віну за дапушчаныя імі скрыўленьні на... ЦК партыі. Аб гэтым сьведчаць матар'ялы, зьмешчаныя ніжэй. Карэспандэнцыя з Полацку добра паказвае, як людзі, якія груба скажалі партыйную лінію, якія правялі бліскучыя здольнасьці ў адміністраваньні, камандваньні, якія раскулачвалі асобных сераднякоў, — зараз замазваюць свае памылкі або спакойна заяўляюць, што яны «ні ў чым не вінаваты». [illegible] такія ўпартасьць, такое двурушніцтва ў прызнаньні ўласных памылак толькі на руку праваму ўхілу, на руку кулаку.

Спробы дыскрэдытаваць лінію партыі выяўляюцца таксама і ў «меркаваньнях» аб тым, што «ўсё правалена», што «перагібы зьяўляюцца сыстэмай» і г. д. Учарашнія ўра-калектывізатары, ахопленыя «гігантаманіяй», якія адміністрацыйным росчаркам пяра стваралі папяровыя калгасы і пускаліся ў перагонкі за процантам калектывізацыі, — сёньня прарочаць крах калгаснага будаўніцтва, ударацца ў паніку, адступаюць перад кулаком. Ліквідуючы ўчора магчымым калектывізаваць увесь СССР за некалькі тыдняў, яны сёньня ў разе выпадкаў папаўняюць сабою рады прапаведнікаў праваапартуністычнай тэорыі «самацёку». Гэта не зьяўляецца выпадковым. Дробна-буржуазная бесхарактарнасьць, пераход ад захапленьня да ныцьця, ад казённага аптымізму да роспачнага пэсымізму — уласьцівы многім нашым гора-калектывізатарам з лягеру «левакоў».

Трэба бязьлітасна біць па ўсіх тых, хто гістэрычна енчыць аб «поўным краху калектывізацыі», хто даводзіць, што «перагібы — неабходная ўмова калгаснага руху». Іх трэба без усялякай літасьці выкрываць, як людзей, якія выконваюць, незалежна ад іх волі, палітычнае заданьне кулака. У процівагу іх антыпартыйным вымышленьням, не паспабляючы барацьбы з перагібамі, дабіваючыся іх хуткага і рашучага выпраўленьня, нам трэба ўзмацніць папулярызацыю і прапаганду нашых посьпехаў у калгасным будаўніцтве. Хіба-ж тое, што мы зараз маем на сёнешні дзень у калгасным будаўніцтве, не зьяўляецца вялізарнейшай перамогай рабочае клясы і яе бальшавіцкай партыі. Гэтыя посьпехі калгаснага будаўніцтва «ўсяляюць у нашу партыю дух бадзёрасьці і веры ў свае сілы. Яны ўзбройваюць рабочую клясу вераю ў перамогу нашае справы. Яны падводзяць да нашай партыі новыя мільённыя рэзервы» (І. Сталін).

Цесьней згуртоўваючы свае рады вакол ленінскага ЦК, пад яго выпрабаваным кіраўніцтвам, выпраўляючы памылкі і скрыўленьні, дапушчаныя ў асобных мясцох, без усялякай літасьці будзем біць правых шаптуноў і гэроў «левай» фразы, якія прабуюць дыскрэдытаваць лінію нашай партыі. Час, які застаўся да XIII-га зьезду КП(б)Б і XVI-га зьезду УсеКП(б), скарыстаем для яшчэ большага ўзмацненьня барацьбы на два фронты як з правым ухілам — галоўнай небясьпекай, так і з «левымі» загібамі і прымірэнцтвам. Разгортваючы бальшавіцкую самакрытыку, будзем даваць суровы і руйнуючы адпор усялякім спробам справа і зьлева дыскрэдытаваць генэральную лінію ленінскай партыі і яе бальшавіцкае ленінскае кіраўніцтва.

Аб скрыўленьні партлініі — у плешчаніцкай арганізацыі

Рэзалюцыя Бюро Менскага АК КП(б)Б ад 3-га мая 1930г.

Заслухаўшы даклад камісіі аб выніках расьсьледаваньня фактаў скажэньня партыйнай лініі ў ПЛЕШЧАНІЦКІМ раёне, бюро АК канстатуе:

1. Бюро Плешчаніцкага РК КП(б)Б мінулага складу і фракцыя РВК груба скажалі лінію партыі тым, што пёзунг партыі аб ліквідацыі кулацтва, як клясы, механічна перанесьлі на месцачковае насельніцтва, у тым ліку і на саматужнікаў. Гэтыя памылкі яшчэ больш паглыбляюцца тым, што рэённае партыйнае кіраўніцтва мінулага складу і фракцыя РВК ведалі аб тым, што ЦК УсеКП(б) папярэдзіў, што пёзунг партыі аб ліквідацыі кулацтва, як клясы, ні ў якім выпадку не павінен пашырацца на месцачковую дробную буржуазію, у асаблівасьці на саматужнікаў.

Скажэньне партыйнае лініі давяло да таго, што ў Плешчаніцкім раёне праводзіліся незаконная нацыяналізацыя дамоў, канфіскацыя маемасьці, перазкладаньне падаткам і дзяньла канфіскаванай маемасьці паміж асобнымі адказнымі працаўнікамі.

2. Сучасны склад бюро раённ[illegible] камітэту хаця і прыступ[illegible] да выпраўленьня [illegible] дапушчаных мінулым партыйным кіраўніцтвам памылак, усё-ж не даволі рашуча асудзіў антыпартыйныя паступкі паасобных партыйцаў і не прыцягнуў вінаватых у скажэньні партыйнае лініі да адказнасьці.

3. Несваячасовае выкрыцьцё такіх грубейшых палітычных памылак і яўна антыпартыйных паступкаў з боку асобных работнікаў і скажэньне партыйнае лініі сьведчыць аб надзвычай слабым разгортваньні самакрытыкі, унутрыпартыйнай дэмакратыі ў арганізацыі, што трэба лічыць зусім ненармальным і недапушчальным.

Выходзячы з таго, што ўсё паданае вышэй сьведчыць аб прытупленьні палітычнага пачуцьця з боку асобных адказных работнікаў, Бюро АК пастанаўляе:

1. Фракцыю РВК, як палітычна збанкрутаваўшую і дапусьціўшую яўныя скажэньні партыйнае лініі—РАСПУСЦІЦЬ.

Запрапанаваць пракуратуры зараз-жа праверыць па ўсіх гапінах факты злачынства ў Плешчаніцкім раёне і вінаватых тэрмінова прыцягнуць да судовай адказнасьці, пасьля чаго мець суджэньне аб іх партыйнасьці.

2. Запрапанаваць РК КП(б)Б непасрэдных вінаўнікаў у скажэньні партыйнае лініі зараз-жа зьняць з работы.

3. Абавязаць бюро Плешчаніцкага РК КП(б)Б зараз-жа мабілізаваць усю партыйную арганізацыю на безадкладнае выпраўленьне ўсіх дапушчаных памылак з боку фракцыі РВК і мінулага складу бюро РК, разгарнуўшы бальшавіцкую самакрытыку, з усёй рашучасьцю выкрываючы недахопы, якія маюцца, для іх безадкладнага зьнішчэньня. Разам з тым, райкому правесьці растлумачэньне сярод працоўнага насельніцтва мястэчка аб тым, што лінія, якая раней праводзілася фракцыяй РВК, ня была лініяй партыі, яўна ёй супярэчыла і што дапушчаныя імі ў сваёй працы мэтады зьяўляюцца палітычна-груба памылковымі.

4. Даручыць фракцыі АВК і сэктару кадраў АК КП(б)Б у 3-хдзённы тэрмін падабраць належных працаўнікоў для Плешчаніцкага раёну.

5. Улічваючы, што скажэньне партыйнае лініі ў Плешчаніцкім раёне праходзіла пад непасрэдным кіраўніцтвам і пры удзеле былога сакратара райкому КП(б)Б т. НОВІКАВА (які зараз працуе на партыйнай работе ў Мазыры) лічыць немагчымым астаўленьне яго ў далейшым на партыйнай працы, аб чым паставіць пытаньне перад ЦК КП(б)Б.

6. Фракцыі АВК праверыць у дзесяцідзённы тэрмін становішча ў гэтай-жа гапіне (факты параабкладаньня, няправільная нацыяналізацыя) па іншых раёнах і аб выніках далажыць бюро АК.

ПРЫМІРЭНЦЫ І АПАРТУНІСТЫЯ

(г. Горкі)

Нядаўна партыйная ячэйка мэліярацыйнага фэкультэту с.-г. акадэміі абгаварыла даклад аб палітыцы партыі на вёсцы і артыкул т. Сталіна «Головокружение от успехов». Сход паказаў, што паасобныя члены ячэйкі па-апартуністычнаму зразумелі апошнія дырэктывы партыі аб калектывізацыі. Рад камуністых, выступаючы ў спрэчках, даводзілі, што «ЦК партыі спазьніўся з дырэктывамі аб барацьбе з перагібамі ў калгасным будаўніцтве». На сходзе мелі месца адкрытыя спробы з боку частка партыйцаў дыскрэдытаваць кіраўніцтва партыі, вваліўшы на ЦК УсеКП(б) віну за памылкі і перагібы, дапушчаныя ў радзе месц у калгасным будаўніцтве. Прыкрываючыся «левымі» фразамі, гэтыя апартуністыя ўпарта прабавалі дыскрэдытаваць генэральную лінію партыі і даведзьці, што «ва ўсім вінават ЦК УсеКП(б)». Адзначым найбольш характэрныя выступленьні.

Сакратар парт'ячэйкі т. Паўлоўскі ў сваім выступленьні выкінуў па адрасе Цэнтральнага Камітэту партыі рад паклёпніцкіх абвінавачаньняў, прабуючы давесьці, што «калі-б ЦК не спазьніўся са сваімі дырэктывамі аб барацьбе з перагібамі, дык памылак у калгасным будаўніцтве было-б значна менш». Гэтае выступленьне [illegible] падтрымана і яшчэ некаторымі.

Паасобныя партыйцы выступалі з яўна «левымі» тэорыйкамі, даводзячы, што «дапушчаныя памылкі выпраўляць ня варта». У гэтым напрамку неабходна аданачыць выступленьне сакратара камсамольскай ячэйкі і члена партбюро тав. Колька.

«Дапушчаныя памылкі і перагібы, — заявіў ён, — выпраўляць ня варта. Калі пасьля таго, як паасобныя беднякі і сераднякі былі «раскулачаны», зьвернуць ім канфіскаваную маемасьць, прыступіць да выпраўленьня перагібаў, то гэта, фактычна, зьяўляецца адступленьнем».

Як сход ячэйкі рэагаваў на ўсе гэты права-апартуністычныя і «левыя» вылазкі супроць партыйнай лініі?

Трэба проста сказаць, што ня была дана рашучага адпору апартуністычным элемэнтам, якія прабавалі атакаваць лінію партыі справа і «зьлева». Ячэйка ня выкрыла з усёй рашучасьцю апартуністых, якія, маскуючыся «левымі» слоўкамі, па сутнасьці прабавалі дыскрэдытаваць бальшавіцкае кіраўніцтва ленінскай партыі. Толькі два таварышы па-бальшавіцку рашуча і рэзка выступілі супроць паклёпніцкіх выпадаў па адрасе ЦК партыі. Дакладчык у сваім заключным слове ня даў патрэбнага адпору анты-партыйным выступленьням паасобных камуністых.

Кіраўніцтва парт'ячэйкі факультэт патрабуе сур'ёзнага аздараўленьня. Чым хутчэй гэта будзе зроблена, тым лепш.

В. РОЗАЎ.

НЕ ПРЫЗНАЮЦЬ ПАМЫЛАК

(ПОЛАЧЧЫНА)

Справаздачна-перавыбарчы сход Несенскай парт'ячэйкі добра паказвае, куды вядуць адсутнасьць самакрытыкі і прымірэнцтва да ўхілаў ад лініі партыі. Іменна таму, што ў ячэйцы няма самакрытыкі, што ячэйка разброена ў барацьбе з правым і «левым» апартунізмам, на справаздачна-перавыбарчым сходзе былі змазаны грубыя палітычныя памылкі, дапушчаныя радам несенскіх партыйцаў.

Справаздачны даклад сакратара ячэйкі па сутнасьці зьявіўся спробай апраўдаць гэтыя памылкі. Паводле слоў сакратара «калектывізацыя ў сельсавеце праходзіла добра. Сіламі ячэйкі сельсавет быў калектывізаван на ўсе 100 проц. Здавальняюча праводзілася работа сярод батрацтва і беднаты».

— Мы маем, хваліўся сакратар, вялікія дасягненьні ў антырэлігійнай работе. З мясцовай царквы... зьняты ўсе званы.

Словам, усё ішло добра да таго часу, пакуль, як падкрэсьліў сакратар у сваім дакладзе, не зьявіўся артыкул тав. Сталіна «Головокружение от успехов». Сакратар ячэйкі топка намякнуў, што прычынай зьніжэньня ў сельсавеце калектывізаванай плошчы «бясспрэчна зьяўляецца гэты артыкул». Закранаючы пытаньні самакрытыкі, сакратар прымушан быў прызнацца, што яна разгорнута слаба. Гэта тлумачыцца тым, заявіў ён, што «мы займаліся калектывізацыяй і таму ня мелі часу разгортваць самакрытыку».

У сапраўднасьці справа стаіць зусім інакш. Наперакор запэўненьням сакратара, работа ячэйкі характарызуецца радам грубых палітычных памылак і скажэньняў партыйнай лініі. Калектывізацыю ячэйка праводзіла шляхам адміністраваньня, націску і г. д.

На сходзе ніхто ад гэтых скрыўленьняў не гаварыў. Ніхто ня даў адпору спробам сакратара апраўдаць дапушчаныя ячэйкай скрыўленьні і перагібы «памылкамі» кіраўніцтва партыі.

Антыпартыйнае выступленьне гэтага ўра-калектывізатара, які зьняў з царквы ўсе званы і адміністрацыйным націскам «калектывізаваў» сельсавет «на ўсе 100 проц.», не зьяўляецца адзіным фактам у Несенскай ячэйцы. Рад іншых партыйцаў з ліку перагібшчыкаў сваёй уласны грубыя палітычныя памылкі прабуюць скарыстаць для дыскрэдытацыі партыйнага кіраўніцтва. Гэтыя апартуністыя адкрыта заяўляюць, замоўчваючы, зразумела, аб дапушчаных імі злачынных скрыўленьнях лініі партыі, што «ЦК адступае і г. д. і г. д.». Камуністыя Вашук і Яршоў, «растлумачваючы» апошнія пастановы ЦК партыі з калектывізацыі, заяўляюць, што «партыя адступае». Вашук, праводзячы а імя ячэйкі сход калгаснікаў, даводзіў ім, што «новы статут с.-г. арцелі для нас няпрыгодны». Нават у пратаколе сходу Вашук прымусіў запісаць спэцыяльную пастанову аб тым, што «новы статут с.-г. арцелі падыходзіць для ЦЧО, але не да БССР».

На справаздачна-перавыбарчым сходзе аб гэтых вылазках супроць партыйнае лініі не гаварылася. Ніхто не асудзіў ня даў адпору апартуністычным элемэнтам ячэйкі, якія прабавалі дыскрэдытаваць бальшавіцкае кіраўніцтва партыі.

Вывады. Кіраўніцтва ячэйкі спаўзло ад лініі партыі і на выгаду кулацтву ўпарта не прызнае сваіх грубых палітычных памылак. Праведзеныя перавыбары ячэйцы не паслужылі сродкам для выяўленьня і рашучага асудженьня гэтых памылак. Відавочна, што скасаваньне перавыбараў і аздараўленьне ячэйкі зьяўляцца мерамі, патрабуючымі куткаваньня.

А—н.

Фрунзаўская арганізацыя ідзе да канфэрэнцыі маналітнай, па-бальшавіцку згуртаванай

На куставым партыйным сходзе Фрунзаўскага раёну

Гэтымі днямі ў клюбе друкароў адбыўся куставы сход Фрунзаўскай раённай партарганізацыі. Сход заслухаў справаздачны даклад сакратара райкому партыі т. Шпэктарава аб рабоце раённага камітэту.

— Работа Фрунзаўскай раённай арганізацыі,—сказаў дакладчык,—праходзіла пад знакам непрымірымай барацьбы з правым і «левым» апартунізмам. Мы маем усе падставы заявіць, што наша раённая арганізацыя ўзброена для барацьбы на два фронты з правым ухілам—галоўнай небясьпекай—і з «левымі» загібамі. Арганізацыя ў асноўным глыбока прапрацавала пастановы XVI-ай партыйнай канфэрэнцыі, XII-га зьезду КП(б)Б і наступных пленумаў Цэнтральнага Камітэту УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б.

Асабліва мы павінны падкрэсьліць работу Фрунзаўскай партыйнай арганізацыі па барацьбе за выразную ленінскую лінію ў нацыянальнай палітыцы. Нацыянал-дэмакратычныя вылазкі ў Фрунзаўскім раёне былі спатканы самым рашучым і жорсткім адпорам. Партыйная арганізацыя пад кіраўніцтвам раённага камітэту па-бальшавіцку ўдарыла на тэорыі і практыцы беларускага нацыянал-дэмакратызму. Аб гэтым сьведчыць, напрыклад, тая рашучасьць, з якою раённы камітэт і ўся Фрунзаўская партыйная арганізацыя ўдарылі па канкрэтных нацыянал-дэмакратычных выступленьнях (тэатральная дыскусія, справа пісьменьніка Зарэцкага, нацыянал-дэмакратычная вылазка Ільлючонка, Марука і Цьвікевіча, пяцігодзьдзе БДВ). Разам з гэтым партыйная арганізацыя рашуча змагалася з шавінізмамі ўсіх колераў.

Асноўнымі пытаньнямі,—сказаў далей т. Шпэктараў,—наўкола якіх была сканцэнтравана ўвага партыйнай арганізацыі і раённага камітэту, зьяўляюцца пытаньні барацьбы за прамфінплян, за сацыялістычнае спаборніцтва і разгортваньне ўдарнага руху. У адпаведнасьці з гэтымі задачамі была праведзена рэарганізацыя партыйна-масавай работы ў вытворчых калектывах. Раённы камітэт за справаздачны пэрыяд правёў гаспадарчую дзейнасьць асноўных заводаў і фабрык Фрунзаўскага раёну. Была праведзена раённая канфэрэнцыя ўдарнікаў, якая абмеркавала асноўныя пытаньні барацьбы за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, за ўзмацненьне ўдарнага руху. Ударны рух на заводах і фабрыках раёну набывае сапраўды масавыя разьмеры. 80 проц. рабочых і работніц Фрунзаўскага раёну ўступілі ва ўдарныя брыгады. Амаль усе 100 проц. членаў і кандыдатаў раённай партарганізацыі, якія працуюць на вытворчасьці, ахоплены ўдарным рухам. Фрунзаўскі камсамол цалкам уступіў ва ўдарныя брыгады.

Спыняючыся на пытаньнях вярбоўкі, т. Шпэктараў падкрэсьліў, што Фрунзаўская партыйная арганізацыя на гэтым вучастку дабілася сур'ёзных посьпехаў. Тэмп росту Фрунзаўскай арганізацыі за справаздачны пэрыяд значна ўзмацніўся. У рады арганізацыі ўцягваюцца перадавыя рабочыя і работніцы ад варштату, ударнікі сацыялістычнага спаборніцтва. За справаздачны пэрыяд партыйная арганізацыя вырасла на 716 чал. Рабочая праслойка ў партыйнай арганізацыі вырасла да 70 проц.

Сыстэматычна праводзіцца работа на вылучэньні. За гэты час вылучаны 144 рабочыя на адказную работу.

Адзначыўшы гэтыя посьпехі і бясспрэчныя дасягненьні, т. Шпэктараў падкрэсьліў, што ў рабоце раённага камітэту мелі месца некаторыя недахопы. Раённы камітэт зрабіў памылку, дапусьціўшы неўгрунтаванае фарсаваньне тэмпаў калектывізацыі прыгарадных сельсаветаў. Яшчэ ёсьць пэўныя недахопы ў кіраўніцтве барацьбой за прамфінплян, у перабудове работы і г. д., і г. д.

У заключэньне т. Шпэктараў выказаў цьвёрдую ўпэўненасьць, што Фрунзаўская партыйная арганізацыя, разгортваючы самую шырокую самакрытыку, яшчэ больш узмоцніць сваю барацьбу на два фронты за генэральную лінію партыі.

Па справаздачнаму дакладу разгарнуліся ажыўленыя спрэчкі. Рад таварышоў у сваіх выступленьнях па дакладу спыняліся на ўсіх пытаньнях і галінах работы раённага камітэту і партыйнай арганізацыі.

Тав. **ЧОРНАБРОДАЎ** у сваім выступленьні паказаў на недапушчальнасьць ніякага паслабленьня барацьбы з нацыянал-дэмакратызмам і шавінізмам. Потым т. Чорнабродаў, завастрыўшы ўвагу на патрэбнасьці ўзмацніць барацьбу з нацыянал-дэмакратызмам і шавінізмамі, перайшоў да пытаньня аб тэарытычнай падрыхтоўцы партыйных мас. Прамоўца адзначыў, што ў Фрунзаўскай арганізацыі вусім слаба пастаўлена партыйная вучоба. Ёсьць рад сур'ёзных недахопаў у тэарытычнай падрыхтоўцы партактыву. Між тым,—сказаў т. Чорнабродаў,—раённы камітэт мала займаўся гэтымі пытаньнямі.

Тав. **ДОЎГАПОЛАЎ** гаварыў аб масавай рабоце Фрунзаўскай арганізацыі. Ён падкрэсьліў, што перабудова гэтай работы праводзіцца яшчэ слаба. У прыватнасьці, т. Доўгаполаў спыніўся на слабасьці антырэлігійнай работы і паказаў, што РК у гэтым напрамку зрабіў мала.

Тав. **НЯХАЙ** заявіў, што раённы камітэт здолеў узброіць партыйную арганізацыю на барацьбу з правым ухілам —галоўнай небясьпекай—і «левымі» загібамі. Далей прамоўца, адзначыўшы некаторыя недахопы кіраўніцтва РК барацьбой за прамфінплян (прарыў на фабрыцы «Беларуска»), перайшоў да пытаньня аб рабоце савецкіх ячэек. Тав. Няхай адзначыў слабую ўвагу раённага камітэту да работы савецкіх ячэек.

Тав. **Чарвякоў** спыняецца на пытаньня калгаснага руху. Шырокая калектывізацыя бяднякоў-серадняцкіх гаспадарак разгортвалася на падставе надзвычайна бурных посьпехаў у справе індустрыялізацыі краіны. У выніку ўзмацненьня ўдзельнай вагі і кіруючай ролі рабочае клясы, у выніку рашучай барацьбы супроць капіталістычных элемэнтаў гораду і вёскі.

Посьпехі калгаснага руху, стварыўшы ўмовы для замены буйной кулацкай вытворчасьці буйной вытворчасьцю саўтасаў і калгасаў, дазволілі партыі перайсьці ў сваёй практычнай працы ад палітыкі абмежаваньня эксплёататарскіх тэндэнцый кулацтва да палітыкі ліквідацыі кулацтва, як клясы. **Гэтыя посьпехі калгаснага руху сталі магчымымі ў выніку рашучага правядзеньня палітыкі моцнага саюзу з серадняком, апоры на беднату і бязьлітаснай барацьбы з кулацтвам.**

На вялікі жаль, у ходзе працы па калектывізацыі як паасобныя партыйцы, так нават і некаторыя партарганізацыі пачалі парушаць палітыку партыі ў вёсцы ў важнейшым пытаньні, у пытаньні аб серадняку. Ад мэтадаў арганізацыйна-растлумачальнай работы сярод мас пачалі ў некаторых выпадках сасьлізгацца да мэтадаў прымусу і ў адносінах да серадняка. Важнейшы прынцып калектывізацыі—добраахвотнасьць, аб якім няўхільна паказваў Цэнтральны Камітэт нашай партыі, пачаў у некаторых мясцох парушацца, скажаючы палітыку партыі.

З другога боку—паяўнасьць уплываў правых элемэнтаў у практыцы працы некаторых работнікаў вылівалася ў няздольнасьць весьці рашучую барацьбу з кулацтвам у саюзе з серадняком.

Гэтыя і іншыя скрыўленьні лініі партыі зьяўляюцца простым парушэньнем лініі партыі, яўным парушэньнем пастаноў ЦК УсеКП(б), ЦК КП(б)Б і служаць на карысьць нашым клясавым ворагам.

Таму гэтыя памылкі і перагібы ў справе калектывізацыі маюць надзвычайную палітычную шкоднасьць.

Адсюль становіцца зразумелай і шкоднасьць тэй маёй памылкі пры калектывізацыі, аб якой гаварыў т. Шпэктараў і аб якой вы, мабыць, ведаеце з друку.

Партыйная арганізацыя Беларусі пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б знайшла ў сябе досыць сіл, бальшавіцкай загартаванасьці для таго, каб своячасова заўважыць гэтыя памылкі, своячасова стаць на шлях рашучага выпраўленьня гэтых памылак. І мы на сёнешні дзень маем ужо пастановы раду камітэтаў партыі, якія прызнаюць свае памылкі, якія рашуча выпраўляюць памылкі, якія мабілізуюць партыйныя арганізацыі на рашучае выпраўленьне гэтых памылак.

Гэтыя памылкі ажывілі дзейнасьць права-ўхілісцкіх элемэнтаў у нашай партыі.

Я зусім разумею ўсю палітычную шкоду, што прынесьлі нашай партыі, сацыялістычнаму будаўніцтву Беларусі мае памылкі, зьвязаныя з памылкамі Букарына, зьвязаныя з памылкамі правых ухілістых.

Партыя, ЦК нашай партыі зрабілі зусім правільна, выкрыўшы гэтыя памылкі, каб вызваць усю партыйную арганізацыю на аналіз, на рашучым асуджэньні гэтых памылак.

Я лічыў і лічу сваім абавязкам пры кожным выпадку спыняцца на гэтых памылках для таго, каб выкрываць іх клясавую дробна-буржуазную сутнасьць, для таго, каб выкрываць іх палітычную шкоднасьць, для таго, каб вызначыць тыя шляхі, што папярэдзяць мяне і іншых таварышоў, якія памыліліся, ад падобных памылак у далейшым.

Клясавая сутнасьць гэтых праваапартуністычных памылак вызначаецца тым націскам на нашу партыю, на рабочую клясу з боку дробна-буржуазных, нэпманскіх элемэнтаў гораду і вёскі, сярод якіх нам прыходзіцца весьці сваю працу.

Гэтыя ўплывы сказваюцца на кожным з нас і яны ў асноўным зьяўляюцца асноўнай крыніцай гэтых памылак гэтых ухілаў.

Выяўляючы гэтыя крыніцы памылак, мы павінны з усёй рашучасьцю ставіць пытаньне аб тым, каб загартаваць сябе і не падпарадкаваца гэтым уплывам.

Памылкі, якія былі мною зроблены ў справе нацыянальнай палітыкі і якія былі мною прызнаны і асуджаны, стараюцца выкарыстаць нацыянал-дэмакраты і нацыянал-апартуністыя, яны імкнуцца зрабіць мяне сваім сьцягам у барацьбе супроць партыі.

Я зусім не хачу, каб хто думаў, што тыя памылкі, якія мною былі ў свой час зроблены,—зьяўляюцца выпадковымі.

У гісторыі выпадковасьці ніколі ня бывае: кожнае зьявішча мае свае прычыны і свае карэньні. Таксама і тыя нацыянал-апартуністычныя памылкі, што мною былі зроблены, маюць пэўныя карэньні і гэтыя карэньні павінны быць выкрыты для папярэджаньня магчымасьці такіх памылак у далейшым.

Карэньнямі гэтых маіх нацыянал-апартуністычных памылак трэба лічыць уплывы з боку дробна-буржуазных нацыянал-дэмакратычных элемэнтаў, з якім я ў першыя гады сваёй рэвалюцыйнай работы быў зьвязан і якія ў сучасны момант імкнуцца самымі рознастайнымі спробамі ўплываць на кожнага з нас, у тым ліку на мяне праз усякага роду спосабы.

Кожнаю з нашых памылак нацыянал-дэмакраты карыстаюцца, як зброяй у барацьбе супроць партыі; усе тыя няправільныя тэорыі, няправільныя ўстаноўкі, што былі мною ў свой час зроблены і што мною своячасова ня былі выкрыты і ня былі абвергнуты—усё гэта зброя ў руках варожых элемэнтаў.

Шкоднасьць і небясьпека нацыянал-дэмакратызму асабліва ярка высьвятляецца на фоне вывучэньня матар'ялаў аб судзе, які адбыўся нядаўна ў Харкаве над украінскімі контр-рэвалюцыянэрамі.

На ўроках гэтага працэсу мы павінны адкрыць вочы ўсім хісткім элемэнтам, каб паказаць сапраўдны твар кулацкай контр-рэвалюцыі, на шлях якое цягне і штурхае нашу краіну беларускі нацыянал-дэмакратызм.

Гэты ўрок тым лягчэй атрымаць, што ў дзейнасьці беларускага нацыянал-дэмакратызму ёсьць шмат падобнага да дзейнасьці украінскай контр-рэвалюцыі.

Праўда, мы ня маем у Беларусі такой цэльнай арганізацыі, якой была арганізацыя СВУ. Але, бязумоўна, асобныя праграмныя тактычныя і г. д. моманты дзейнасьці беларускага нацыянал-дэмакратызму падобны да украінскага нацыянал-дэмакратызму.

Вось цікавая гістарычная справўка.

— Пэрыяд 1917 г.—украінская нацыянальная рада на Украіне вядзе шалёную барацьбу супроць Кастрычніцкай рэвалюцыі, у Беларусі ў гэты час і ў гэтых мэтах дзейнічала беларуская рада.

— На Украіне пачынаецца эпалея Скарападзкага.

— У Беларусі мы маем тэлеграму з боку беларускіх контр-рэвалюцыянэраў да Вільгэльма, каб ён прыняў Беларусь пад сваю ўладу. Мы маем перагаворы беларускіх нацыянал-дэмакратаў з нямецкім камандваньнем аб дапамозе беларускім нацыянал-дэмакратам зацьвердзіць рэспубліку — накшталт украінскай.

— На Украіне украінская контр-рэвалюцыя вылілася ў дырэктарыю Пятлюры—з пагрозамі мястэчак, зьдзекамі над рабочымі і беднатой і г. д.; на Беларусі мы маем аналёгічную беларускую контр-рэвалюцыю ў якасьці дзейнасьці Балаховіча.

— Украінская контр-рэвалюцыя знаходзіцца ў сувязі з контр-рэвалюцыяй Дону, Сібіры, Паўночна-Заходняга краю і г. д.

Прачытайце справаздачнасьць дыпляматычнай місіі беларускай народнай рэспублікі. У гэтых справаздачах таксама знойдзецца паказаньні аб тым, што прадстаўнікі беларускай народнай рэспублікі ўступалі ва ўзаемаадносіны з Урангелем, Дзянікіным, Чайкоўскім і г. д.

Усюды, дзе выяўлялася контр-рэвалюцыя, зьяўляліся прадстаўнікі беларускай народнай рэспублікі, якія імкнуліся знайсьці змычку з гэтай контр-рэвалюцыяй для барацьбы супроць дыктатуры пралетарыяту, супроць савецкай улады, супроць камуністычнай партыі.

Вазьмеце, таварышы, далейшы пэрыяд—пэрыяд заграничнай дзейнасьці эміграцкіх груп Украіны; дзейнасьць беларускага нацыянал-дэмакратызму гэтых часоў знаходзіцца таксама ў паўнай адпаведнасьці.

Ліга Нацый, 2-гі, 2-гі з паловай Інтэрнацыянал, калідоры ўрадаў Польшчы, Францыі і г. д.—гэта ёсьць тыя пункты, дзе яны шукаюць дапамогі і дзе даюць грошы на ўтрыманьне беларускай контр-рэвалюцыі.

Потым, таварышы, пачынаецца пэрыяд зьмены вех. Стараецца тэорыя, якая павінна дапамагчы нацыянал-дэмакратам знайсьці шляхі для пераходу ў Савецкую Беларусь.

Вядомы вам нацыянал-фашысты Луцкевіч, які зьяўляецца ідэолёгам кулацкіх элемэнтаў і беларускага нацыянал-дэмакратызму, які знаходзіцца ў цеснай сувязі з польскім фашызмам і дапамагае польскаму фашызму ў падрыхтоўцы нападу на СССР, стварае тэорыю аб тым, што беларуская сацыялістычная грамада—гэта ёсьць першая рэвалюцыйная бальшавіцкая арганізацыя, якая зьяўляецца прарадзіцельніцай камуністычнай партыі. Ён даводзіць, што сучасная КП(б)Б—гэта ёсьць вынік разьвіцьця работы беларускай сацыялістычнай грамады. Ён даводзіць, што сучасная Беларуская Савецкая рэспубліка—гэта ёсьць прадаўжальнік «Нашай Нівы» і «Нашай Долі». Ён даводзіць, што Беларуская Савецкая рэспубліка—гэта ёсьць этап да больш высокай ступені разьвіцьця беларускай дзяржаўнасьці якая знойдзе сваё поўнае ажыцьцяўленьне ў форме беларускай народнай буржуазна-дэмакратычнай рэспублікі. Адсюль ставіцца задача: усе «жывыя» сілы ў Савецкую Беларусь, бо Менск ёсьць адзіны цэнтр, які сапраўды ажыцьцяўляе ідэалёгію поўнага дзяржаўнага, палітычнага, эканамічнага, культурнага адраджэньня Беларусі.

Гэта тэорыя зьяўляецца контр-рэвалюцыйнай тэорыяй па сваёй прыродзе. Гэта тэорыя зьяўляецца контр-рэвалюцыйнай тэорыяй у сваёй мэтаімкнёнасьці. Гэта тэорыя зьяўляецца тэорыяй, якая ставіць сваёй мэтай разбіць рабочую клясу, якая ставіць сваёй мэтай ідэалёгічна разбіць камуністычную партыю, каб падрыхтаваць глебу для кулацкай контр-рэвалюцыі. Гэта тэорыя ставіць сваёй мэтай уплываць на работу савецкай улады для перараджэньня гэтай Савецкай

Пералому ў рабоце нашых прафсаюзаў яшчэ няма

I. Складаныя і адказныя задачы стаяць перад прфсаюзамі Беларусі. Прыцёк вясковых мас новых рабочых, наяўнасьць інтернацыянальнага пераплёту, значны пласт батракоў і пастухоў на вёсцы, абвастрэньне клясавай барацьбы, выхадзкі клясавых ворагаў і іх агентаў над сьцягамі антысэмітызму, шавінізму і нацдэмакратызму, — патрабавалі і патрабуюць ад прафсаюзаў Беларусі напружанай работы на згуртаваньні сіл пралетарыяту, на клясавым, інтэрнацыянальным выхаваньні рабочых, па ўцягненьні шырокіх мас рабочых у актыўнае сацбудаўніцтва.

XII зьезд КП(б)В у рэзалюцыі аб рабоце прафсаюзаў адзначаў, што ў прафсаюзах БССР ёсьць выпадкі «бюракратычных, няўважлівых адносін да патрэб рабочых, чыноўніцкага адрыву ад масы, разлажэньня паасобных кіраўнікоў прафарганізацый, грубых парушэньняў прафсаюзнай дэмакратыі, невыстарчальнага разгортваньня самакрытыкі».

У жніўні 1929 г. прэзыдыум УсеЦСПС прызнаў наяўнасьць у прафруху БССР раду буйнейшых палітычных недахватаў, якія ў асноўным зводзяцца да наступнага: невыстарчальна наладжана кіраўніцтва сацпаборніцтвам, не разгорнута работа з новымі кадрамі рабочых, слаба праводзіцца праверка выкананьня прафсаюзных дырэктыў, кепска арганізавана жывая сувязь кіраўнікоў прафарганізацый з прадпрыемствамі і рабочай масай, слаба пастаўлена інтэрнацыянальнае выхаваньне рабочых мас.

З часу XII-га зьезду КП(б)В мінула больш году, абсьледваньне УсеЦСПС скончылася каля 9 месяцаў таму назад. Тэрмін выстарчальны для дасягненьня пералому ў рабоце па зьнішчэньні паказаных недахватаў. Але... недахопы ня зьнішчаны, дырэктывы ня выкананы.

Праўда, было-б памылкова сьцьвярджаць, што прафсаюзы БССР ня маюць дасягненьняў у сваёй рабоце.

У выніку палепшэньня работы прафсаюзаў у вёсцы ўзмацнілася кіруючая роля прафсаюзаў у галіне сацыялістычнай перабудовы вёскі — гэта адно з важнейшых і асноўных дасягненьняў у рабоце прафсаюзаў БССР Сваячасова і здавальняюча праведзена апошняя кампанія, восеньню 1929 г. праведзена масавая праверка дагаварочаў сацпаборніцтва і г. д. Але разам з гэтым трэба адзначыць, што прафсаюзы БССР і яго кіраўнічыя органы па радзе важнейшых пытаньняў ня выканалі дырэктыў партыі і УсеЦСПС.

ШТО ВЫКРЫВАЕЦЦА ПРЫ АБСЬЛЕДВАНЬНІ ПРАФАРГАНІЗАЦЫЙ

Скажэньні лініі партыі гніль і інэртасьць выяўляюцца пры кожным абсьледваньні прафарганізацый.

Абсьледваньне сакзу швэйнікаў выявіла, што саюз несвачасова і нерапуча даваў адпор цэхавым і адсталым настроям паасобных груп рабочых, асабліва з новых кадраў, што саюз не падхватваў ініцыятыву перадавых рабочых у справе разьвіцьця сацыялістычнага спаборніцтва, не праводзіў рашучай барацьбы з антысэмітызмам, шавінізмам, нацыянальнай абмежаванасьцю г. д.

Яшчэ больш сумная карціна выяўлена пры абсьледваньні ЦП саюзу саўгандальслужачых. ЦП гэтага саюзу прайшло міма раду сур'ёзных палітычных пытаньняў: сацспаборніцтва, чыстка апарату, барацьбы з бюракратызмам і раду іншых важнейшых пытаньняў.

Абсьледваньне ЦП саюзу працмастацтва выявіла, што ЦП аказалася нядольным мабілізаваць актыўнасьць членаў прафсаюзаў на барацьбу за клясава - пралетарскі рэпэртуар, не заварыла ўвагі рабочых мас і членаў саюзу вакол буйных ідэалёгічных прарываў у тэатральнай рабоце і г. д.

ЦП саюзу дрэваапрацоўшчыкаў прыірэнча адносілася да работы і выладзіць (жа да арганізацыі забастовак) опір - рэвалюцыйнай групы трацкістых на Менскай мэблевай фабрыцы.

Нядаўна абсьледвана работа прафсаюзаў Мазырскай акругі. Што-ж там выўлена? Прафарганізацыі не кіравалі сацспаборніцтвам, ні адна ударная брыгада ня мае канкрэтнага заданьня, зусім слаба разгорнута самакрытыка, барацьба з апартунізмам у практыцы рафработы не вядзецца, важнейшыя дакуманты партыі (аб адзінаначальні, дозва ЦК УсеКП(б) ад 25-1 30 г., адозва УсеЦСПС «Прафсаюзы, тварам да вытворчасьці») не даведзены да мас членаў прафсаюзу, не прапрацаваны.

Як-жа прэзыдыум ЦСПСБ рэагаваў на гэтыя канкрэтныя факты апартуністычных і бюракратычных скажэньняў лініі партыі ў прафсаюзах?

Як агульнае зьявішча, трэба адзначыць, што ЦСПСБ толькі тады бярэцца за праверку работы таго ці іншага саюзу, калі друк настойліва гэтага патрабуе і сыгналізуе. Аднак, і ў гэтых выпадках ЦСПСБ выкрывае недапушчальную маруднасьць. Так, аб недахватах у саюзе швэйнікаў друк сыгналізаваў у студзені 1929 г., абсьледваньне гэтага саюзу скончана ў маі, даклад аб рабоце саюзу заслухан у ліпені, а рэзалюцыя па справаздачы ЦП зацьверджана ў кастрычніку, прычым, канстатуючы скажэньні асноўных дырэктыў партыі, ЦСПСБ не адважыўся зрабіць адпаведныя аргвывады, а абмежаваўся пастановаю аб умацаваньні апарату ЦП саюзу.

У маі 1929 г. друк сыгналізаваў аб скажэньнях лініі партыі і аб заціску самакрытыкі ў ЦП саюзу саўгандальслужачых. Тады прызналі неабходным правесьці абсьледваньне саюзу, але нічога канкрэтнага для ажыцьцяўленьня гэтае пастановы не зрабілі. І толькі пасьля паўторных і шматлікіх патрабаваньняў друку, у кастрычніку 1929 году праводзіцца абсьледваньне работы гэтага саюзу, у выніку чаго прышлося распусьціць прэзыдыум ЦП саюзу саўгандальслужачых, зьняць з работы ўсіх кіраўнічых работнікаў ЦП і распусьціць гомельскае праўленьне.

ЦСПСБ, зацягнуўшы на паўгода рэагаваньне на абураючыя факты, пакаваныя друкам, дапусьціўшы гэтым паглыбленьне і разьвіцьцё скажэньняў лініі партыі ў рабоце саюзу саўгандальслужачых, так вызначае сваю віну: «Прэзыдыум ЦСПСБ лічыць непарэмальнай зацяжку абсьледваньня работы ЦП саюзу з боку ЦСПСБ, што стварыла некаторае спазьненьне ў вырашэньні пытаньня аб стане работы ў саюзе».

Сыгналы аб тым, што ў саюзе працмастацтва ня ўсё добра, чутны былі на старонках друку яшчэ ў лістападзе 1929 г., тым ня менш абсьледваньне пачынаецца толькі ў студзені 1930 г., а даклад аб рабоце саюзу заслухоўваецца 4-га красавіка 1930 г. І зноў, замест рашучых мер, ухваляецца пастанова аб умацаваньні апарату саюзу.

У РОЛІ СЬВЕДАК

КП(б)В і ўся рабочая кляса БССР пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)В дала руйнуючы адпор «прышчэпаўшчыне», гэтай спробе агентаў кулака захапіць пазыцыі ў дзяржапараце БССР; ня менш руйнуючы ўдар атрымалі нац дэмакраты і шавіністы ўсіх колераў, якія прабавалі захапіць пазыцыі ў Наркамасьветы і інш. органах і праводзіць свае вылазкі.

Здавалася-б, роля прафсаюзаў у гэтай барацьбе супроць вылазак клясавага ворага павінна быць асабліва значнай. Трэба было арганізаваць шырокія масы рабочых для барацьбы супроць клясавага ворага. Але і тут роля прафсаюзаў зьвялася да нуля. У барацьбе супроць «прышчэпаўшчыны» і нац. дэмакратызму прафсаюзы адсутнічалі.

АСНОЎНАЕ ЗЬВЯНО ПРАФРАБОТЫ НЯ СХОПЛЕНА

Асноўным зьвяном прафработы ў даны момант зьяўляецца сацспаборніцтва.

Праверка прычын прарываў у выкананьні прамфінпляну ў першым паўгодзьдзі 1929-30 году выявіла, што рад прафарганізацый яшчэ да гэтага часу ня кіруюць сацспаборніцтвам, не дапамагаюць у рабоце ўдарных брыгад, а ў асобных выпадках зусім стаяць у баку ад гэтай справы (зав. «Пралетары» ў Гомелі, Віцебскі і Аршанскі чыгуначныя вузлы, «Зьвязда» ў Мозыры і рад іншых).

Пастановы ўсесаюзнага зьезду ўдарнікаў не прапрацаваны ў масах. Вынікі праведзеных па ўсіх акругах зьездаў і канфэрэнцый ударнікаў ні ў ЦСПСБ, ні ў акругах не падагулены і не прапрацаваны ў масах. За асноўнае зьвяно прафработы прафарганізацыі БССР не ўхапіліся і ня могуць ухапіцца з-за сваёй інэртасьці і ненаваротлівасьці.

Ні адно ЦП саюзу не разгледзела пляну рацыяналізацыі прамысловасьці на 1929-30 год, а прэзыдыум ЦСПСБ толькі 14-га красавіка сабраўся разгледзець пытаньне аб рацыяналізацыі прамысловасьці. Выяўлена, што замест прадугледжаных па прамфінпляне 300.000 р. на рацыяналізацыю, у першым квартале гэтага гаспадарчага году выдаткавана ўсяго 60.000 руб., а 240.000 руб. аказаліся ў «эканоміі». Пытаньням вынаходніцтва ўдзяляецца настолькі мала ўвагі, што рад буйнейшых гаспадарчых органаў, як Шклатрэст, Харчтрэст, Белдзяржсьпірт, Днапроўская Мануфактура, суконная фабрыка, панчошная фабрыка і інш. адмовіліся прадставіць на першую ўсебеларускую выстаўку экспанаты вынаходніцтва, з прычыны іх адсутнасьці.

Рад пытаньняў, якія маюць вялізарнае значэньне ў жыцьці Беларусі зусім выпалі з поля зроку ЦСПСБ. Так, пытаньні аб лесасплаве, аб капітальным будаўніцтве і інш. зусім не абмяркоўваліся. Пытаньне аб будаўнічым сезоне дасхала да прэзыдыуму ЦСПСБ толькі 14-га красавіка, калі будаўнічыя работы ўжо фактычна пачаліся.

КУЛЬТРАБОТА НЕ ПРАСЯКНУТА ПАЛІТЫЧНЫМ ЗЬМЕСТАМ

Культустановы прафсаюзаў БССР да гэтага часу цягнуцца ў далёкім абозе руху мас. Усе рэзалюцыі ЦК КП(б)В і УсеЦСПС аб увязцы культработы з важнейшымі палітычнымі задачамі дня застаюцца на паперы.

Праверыні выкананьне сацдагавораў, аказалася, што культработа не прыстасавана да задач сацспаборніцтва. Падагулілі апошнюю калдагаворную кампанію, аказалася, што культработа саюзаў не адбіла гэтай важнейшай палітычнай кампаніі. Прафсаюзныя клюбы ў 4-5 раз больш паладжваюць спэктакляй і канцэртаў, чым лекцый, дакладаў і гутарак, не гаворачы ўжо аб якасьці гэтае работы.

Вельмі прыгожыя рэзалюцыі ўхвалены ЦСПСБ па пытаньні аб ліквідацыі няпісьменнасьці, але і тут рэчаіснасьць зьяўляецца процілеглай рэзалюцыям. Пры павялічэньні колькасьці навучаемых няпісьменных усё-ж пляны ліквідацыі няпісьменнасьці сярод індустрыяльных рабочых на працягу гэтага году фактычна сарваны. Яшчэ горш абстаіць з гэтай справай па саюзе сельгаслесрабочых, які мае вялізарную армію няпісьменных батракоў.

—ДЫРЭКТЫВЫ ПАРТЫІ АБ АХОПЕ ПРАЦЫ НЯ ВЫКАНАНЫ

Грунтуючыся на наяўных фактах, можна пэўна паказаць, што тут ня толькі няма пералому але становішча яшчэ пагоршылася. На 1928-29 год было асыгнавана на мерапрыемствы па тэхніцы бясьпечнасьці і ахове працы 700 тыс. руб. Фактычна выдаткавана 205.652 руб., або 29,3 проц. Засталося «эканоміі» 494.348 руб. Фабрыка «Дзьвіна», якая ў 1927-28 гаспадарчым годзе выдаткавала 25 проц. асыгнаваньняў на ахову працы і якая падаецца ў рэзалюцыі УсеЦСПС, як адмоўны прыклад, у 1928-29 годзе выдаткавала з 68.000 руб. 1.419 руб., або 2,1 проц. (!). Такія-ж прыклады ёсьць па радзе прадпрыемстваў Рад буйнейшых прадпрыемстваў ні аднэй капейкі не выдаткавалі з адпушчаных сродкаў на ахову працы.

Калі пры патураньні прафсаюзаў БССР дзесяткі і сотні тысяч рублёў, адпушчаных на ахову працы, аказваюцца ў «эканоміі» ня можа быць упэўненасьці ў тым, што адпушчаная ўрадам вялізарнейшая сума ў 1.185 тыс. руб. будзе поўнасьцю і мэтазгодна скарыстана.

Усё гэта выразна характарызуе тыя важнейшыя палітычныя прарывы, якія мелі і маюць месца ў рабоце прафсаюзаў Беларусі.

Паглядзім, пры якіх умовах сталі магчымы такія прарывы.

ПЕРАБУДАВАЛІСЯ НА ПАПЕРЫ

Старыя формы і мэтады работы — вось асноўная прычына хваравітасьці прафработы БССР.

Перабудова прафработы пачалася з перамены шыльд, замест трох алдзелаў вісяць шыльды, якія прапагандуюць іспаваньне 7 сэктараў Але чаму 7? А таму, што так перабудаваў сваю работу УсеЦСПС, а праект перабудовы ЦСПСБ проста цалкам сьпісан з праекту перабудовы УсеЦСПС. Арганізавалі сэктар масавай работы, а што гэтаму сэктару рабіць — ніхто ў ЦСПСБ ня ведае, і сэктар гэты існуе толькі ў рэзалюцыі Не забылі і павялічыць штат ЦСПСБ Забылі толькі адно — перабудаваць работу.

Аб прыцягненьні да работы ЦСПСБ добраахвотнікаў [illegible] многа, доўга і ня раз. Ухвалілі аб гэтым рэзалюцыю ў лістападзе, прынялі яшчэ рэзалюцыю ў студзені, прынялі і ў лютым, і ў сакавіку. Але дарэмна мы пачалі-б шукаць у сэктарах ЦСПСБ рабочых-ударнікаў працуючых, як добраахвотнікі, на прафработе.

Замест паскарэньня перабудовы пізавых прафарганізацый, аргінструктарскі сэктар ЦСПСБ даў направільную ўстаноўку ад правядзеньні перабудовы выключна пры правядзеньні перавыбараў ФЗМК.

«ЗАСЕДАТЕЛЬСКАЯ СУЕТНЯ»

У рэзалюцыях ЦСПСБ сваячасова зьвернута ўвага на патрэбнасьць барацьбы з «заседательской суетней», на патрэбнасьць праверкі выкананьня, выразнасьці работы і аб іншых добрых рэчах. Але на жаль, ва ўсімі гэтымі словамі ня відаць жывое справы. Прэзыдыум ЦСПСБ упарта і хранічна хварэе і «заседательской суетней» і адсутнасьцю праверкі выкананьня, і нявыразнасьцю сваёй работы.

З-за непадрыхтаванасьці пытаньняў прыходзіцца па важнейшых пытаньнях вылучаць камісіі для «апрацоўкі рэзалюцыі ў трохдзённы тэрмін» (як пішацца ў пратаколах), фактычна-ж атрымліваецца, што ў камісіях пытаньні не вырашаюцца, пытаньне, трапіўшае ў камісію, пахавана падоўга, а часамі і назаўсёды. Так, пытаньне аб рэарганізацыі сыстэмы кіраўніцтва прамысловасьцю ставілася на пасяджэньні прэзыдыуму ЦСПСБ 24-га лістапада, 4-га сьнежня, 14-га сьнежня і абмеркавана 24-га сьнежня 1929 году. Пасьля абмеркаваньня на прэзыдыуме даручана падта аўтарытэтнай камісіі прадставіць рэзалюцыю ў 6-дзённы тэрмін. З гэтага часу ўжо прайшлі 4 месяцы, а рашэньня яшчэ няма і невядома, калі будзе. Такі-ж лёс рэзалюцыі па дакладу ВСНГВ аб выкананьні прамфінпляну, аб дамах адпачынку для работніц у пасьлядовы перыяд і раду інш.

ПРАФСАЮЗНАЯ ДЭМАКРАТЫЯ І САМАКРЫТЫКА РАЗГОРНУТЫ НЕДАСТАТКОВА

У кастрычніку прэзыдыум ЦСПСБ два разы выносіў пастанову, у якой усе ЦП саюзаў абавязваліся абмеркаваць сярод рабочых пытаньне аб скарыстаньні сродкаў, сабраных у фонд індустрыялізацыі. Гэта пастанова засталася не рэалізаванай. 21-га студзеня 1930 году пастанавілі абмеркаваць сярод рабочых праект пабудовы новага тэатру ў гор. Менску, пасьля чаго паставіць на прэзыдыум. Засталася на паперы. Пастаноўлена вынесьці на шырокае абмеркаваньне рабочых мас пытаньні аб рэарганізацыі кіраўніцтва прамысловасьцю, выклік Менскае акругі Мазырскім АПБ на сацспаборніцтва па пытаньні аб выкананьні пастаноў III-га пленуму УсеЦСПС, выклік Віцебскага АПБ на сацспаборніцтва па пытаньні аб ліквідацыі няпісьменнасьці, праект пабудовы дамоў - камун, аб пераводзе ўсіх прадпрыемстваў на пяціднёўкі і рад іншых. Ва ўсіх гэтых выпадках пастановы прэзыдыуму ЦСПСБ засталіся нявыкананымі.

За апошнае паўгодзьдзе ў Віцебску і Гомелі ў буйнейшых пралетарскіх цэнтрах Беларусі выкрыт рад фактаў заціску самакрытыкі, апартуністычнага скажэньня лініі партыі. Усе гэтыя зьявішчы мелі месца на прадпрыемствах сярод рабочых. Якую-ж ролю адыгралі прафсаюзы гэтых акруг у справе выкрыцьця і ліквідацыі гэтых прарываў? Прафсаюзы пры выкрыцьці і ліквідацыі гэтых зьявішч адсутнічалі.

VIII пленум ЦСПСБ вынес аб самакрытыцы спэцыяльную пастанову:

«Даручыць прэзыдыуму ЦСПСБ у двухмесячны тэрмін правесьці агульную праверку выкананьня прафарганізацыямі дырэктыў партыі і вышэйшых прафорганаў у галіне разгортваньня самакрытыкі і распрацаваць мерапрыемствы па забесьпячэньні далейшага паглыбленьня самакрытыкі, як базы перабудовы работы прафсаюзаў і зьнішчэньня недахопаў і паасобных бюракратычных скажэньняў у рабоце»...

З часу пленуму прайшло ўжо ня два, а больш трох месяцаў, і ніхто яшчэ ня думае прыступіць да выкананьня гэтае пастановы. Толькі пасьля доўгіх спрачак з некаторымі працаўнікамі ЦСПСБ пункт аб правядзеньні праверкі самакрытыкі быў у красавіку ўнесены ў плян работы ЦСПСБ, але без указаньня тэрміну і потым вяліся бясконцыя спрэчкі аб тым, які сэктар павінен праводзіць гэту праверку, які сэктар павінен «ведаць самакрытыкай». Спрэчкі яшчэ да гэтага часу ня вырашаны.

***

«Пры дачы адзнакі работы паасобных прафарганізацый трэба выходзіць з таго, наколькі рашуча і выразна яна перабудавала сваю работу па ажыцьцяўленьні пастановы III пленуму УсеЦСПС» Прэзыдыум ЦСПСБ, як мы бачым, недастаткова разгарнуў барацьбу супроць апартуністычных і бюракратычных элементаў прафруху БССР У выніку сапраўдная перабудова прафсаюзнай работы па-новаму заціваецца. Патрэбных бальшавіцкіх тэмпаў у рабоце яшчэ няма.

Прафарганізацыі не змаглі яшчэ пасапраўднаму стаць на чале працоўнага энтузіязму шырокіх мас рабочых (сацспаборніцтва, ударніцтва) і зрабіць прафсаюзную работу масавай, прыцягваючы рабочых ударнікаў у якасьці добраахвотнікаў да актыўнае прафработы. Ясныя і выразныя дырэктывы партыі і УсеЦСПС аб рабоце прафсаюзаў ня выкананы.

Падрыхтоўка да XIII зьезду КП(б)В і да XVI зьезду УсеКП(б) павінна прыцягнуць увагу ўсёй КП(б)В да становішча прафсаюзаў, да патрэбнасьці дабіцца сапраўднага правядзеньня ў жыцьцё дырэктыў партыі.

Перавыбары прафорганаў, падыходзячы зьезд прафсаюзаў БССР, павінны прайсьці пад знакам разгортваньня самакрытыкі, самаправеркі і выяўленьня ўсіх недахопаў у рабоце прафсаюзаў. Уся маса членаў прафсаюзаў, у першую чаргу рабочыя - ударнікі павінны быць мабілізаваны на перабудову работы ўсіх зьвеньняў прафсаюзаў, на рашучы паварот іх тварам да вытворчасьці.

Прафработа павінна быць перабудавана па-новаму, у адпаведнасьці з задачамі рэканструкцыйнага пэрыяду. Пад кіраўніцтвам партыі яна будзе перабудавана.

М. ШАПІРА.
С. ВАШКЕВІЧ.

Увага мясной праблеме

Да 1 чэрвеня скончыць кантрактацыю 150.000 цялят

БЕЗАДКЛАДНА СПЫНІЦЬ ЗАБОЙ МАЛАДНЯКА

Праблема жывёлагадоўлі зьяўляецца вуалявым пытаньнем нашай гаспадарчай палітыкі на бліжэйшы час. Скарачэньне стада за апошнія гады з прычыны недахвату кармоў і разбазарваньня жывёлы мінулай восеньню пад уплывам кулацкай агітацыі, стварыла цяжкасьці для ўсяе народнае гаспадаркі і ў першую чаргу для прамысловасьці і рабочага забесьпячэньня. Адгэтуль і зразумела, чаму партыя і савецкая ўлада так рашуча ставяць пытаньні аб мерапрыемствах па аднаўленьні стада, па вырашэньні праблемы жывёлагадоўлі.

Асноўным мерапрыемствам па аднаўленьні стада зьяўляецца будаўніцтва буйных жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасаў. Але было-б памылкова ня ўлічваць ролі індывідуальнага сэктару сельскай гаспадаркі, лічыць будаўніцтва буйных гаспадарак адзіным мерапрыемствам на аднаўленьні стада. У сучасны момант да гэтай справы шляхам адпаведных эканамічных і адміністрацыйных мерапрыемстваў павінна быць прыцягнута ўся маса індывідуальных бяднякоў - серадняцкіх гаспадарак. Асноўнымі мерапрыемствамі эканамічнага характару зьяўляецца кантрактацыя жывёлы, асабліва цялят і ільготы па с.-г. падатку.

Але сучаснае становішча жывёлагадоўлі дыктуе не абмяжоўвацца толькі эканамічнымі мерапрыемствамі, але і ў адміністрацыйным парадку забараніць усялякі забой маладняка — цялят і сьвіньняў, — які прыдатны для вырошчваньня яц у абагуленым сэктары, так і ў індывідуальным.

Пастановай ураду да 1-га чэрвеня павінна быць праведзена кантрактацыя 150 тысяч цялят, для чаго вылучаны адпаведныя крэдыты і кармы.

Здавалася-б, што гэтыя мерапрыемствы, як рашаючыя па аднаўленьні стада, павінны былі прыкаваць да сябе ўвагу ўсіх мясцовых органаў улады і ўсёй грамадзкасьці, каб правесьці іх ва ўдарным парадку з усёй бальшавіцкай настойлівасьцю. На справе-ж атрымалася зусім іншае. Кантрактацыя ідзе вяла чына дрэнна, працягваецца забой цялят, як быццам няма закону аб забароне яго. Забой ідзе ня толькі ў вёсцы, але і на гарадзкіх бойнях, саўгасы і калгасы адмаўляюцца забіраць для вырошчваньня цялят ад мясазагатоўшчыкаў і ад індывідуальных сялян. За дэкаду кантрактуецца 1.000 шт. цялят, а загатаўляецца цялячых скур — 10-15 тыс. Тут заўважваюцца яўна злачынныя адносіны да гэтага важнейшага мерапрыемства з боку арганізацый, якія абавязаны весьці кантрактацыю і мясцовых нізавых савецкіх органаў, РВК і сельсаветаў. Сялянства ў сваёй масе ня ведае аб умовах кантрактацыі і аб забароне забою. Мясцовыя органы, спасылаючыся «перагібаў», парашылі ня ўмешвацца ў справу індывідуальных гаспадарак, нават па пытаньні забою цялят. Наркамзем і Калгасцэнтр не забясьпечылі, каб саўгасы і калгасы сапраўды прымалі прапанаваных ім цялят. Мясазагатоўшчыкі не зразумелі, што вырашыць праблему мяса трэба не праз забой цялят, а іменна праз вырошчваньне іх. Акрвыканкомы не ўзялі ў свае рукі гэту вялікую справу, а прымусілі яе на «сумленьне» іншых арганізацый.

Часу засталося вельмі мала. Ацёл хутка канчаецца. Усялякая нядбайнасьць да гэтага пытаньня павінна разглядацца, як салзейнасьць зьнішчэньню стада. За барацьбу з гэтым злом павінны ўзяцца партыйныя арганізацыі і ўся савецкая грамадзкасьць. Толькі пры гэтай умове мы не на словах, а на справе будзем праводзіць лінію партыі ў аднаўленьні сельскай гаспадаркі, у забесьпячэньні рабочых цэнтраў.

АБРАМСОН.

Рыбаводзтва БССР у занядбаньні

У БССР ёсьць 82.000 гэктараў вазёр, у якіх з посьпехам можа весьціся рыбная гаспадарка. Аднак, Наркамзем, які да гэтага году навіпен быў цікавіцца справай рыбаводзтва, нічога ў гэтым напрамку не зрабіў. «Белрыба», якая зараз загадвае рыбнай справай, таксама амаль ня ўжывае практычных мерапрыемстваў да фарсаваньня рыбаводзтва.

Аб прадукцыйнасьці нашых вазёр ні «Белрыба», ні Наркамзем нічога ня ведаюць. Рыбныя вадаёмы да гэтага году здаваліся ў арэнду прыватнікам, якія драпежна вылаўлялі рыбу і не клапаціліся аб яе разьвядзеньні.

Наогул вазёры знаходзяцца ў злачынна бесгаспадарчым становішчы. Большасьць з іх засьмечана ўсялякімі адкідамі, што перашкаджае разьвіцьцю і лоўлі рыбы.

Дзейнасьць «Белрыбы» абмежавалася тым, што 12.500.000 малькоў сігі і рапушкі спушчаны ў вазёры. Гэта дасьць эфэкт праз 4-5 год. Плян засяленьня вазёр угром сарваны. Паводле заявы «Белрыбы», гэта адбылося па віне «Саюзрыбы», якая абяцала прысылаць 7 мільёнаў штук маладых угроў і свайго абяцаньня ня выканала.

Кіраўніцтва «Белрыбы» месцамі заключаецца толькі ў рассылцы дырэктыў і цыркуляраў. Ніякага-ж кантролю за выкананьнем сваіх дырэктыў «Белрыба» да гэтага часу не наладзіла.

Яшчэ горшая справа з арганізацыяй і аднаўленьнем прудавых гаспадарак. Мім тым, прудавыя гаспадаркі ў БССР маюць вялікія пэрспэктывы і заслугоўваюць асаблівай увагі. Трэба адначыць магчымасьці ў гэтай галіне. Пры правядзеньні мэліярацыі, якая ў БССР займае вялікае месца, можна з посьпехам скарыстоўваць вадаёмы, якія штучна стварацца, для разьвядзеньня рыбы. Пляны гэтага мерапрыемства прадугледжваюць, але на справе пакуль што амаль нічога ня зроблена. Мэліярацыя ня ўвязана з стварэньнем прудавых гаспадарак. Такім чынам, гэты прабел, на гледзячы на шматлікія гутаркі і пляны, пакуль што не запаўняецца.

На сёньняшні дзень у БССР налічваецца шмат дробных прудавых гаспадарак на плошчы 1.500 гэктараў. Аб гэй увазе, якая аддаецца гэтым гаспадаркам, сьведчыць хаця-б той факт, што некалькі дзён таму назад каля 50 проц. рыбы прудавых гаспадарак вымерла... ад невядомых прычын, як кажуць спэцыялісты. Прудавыя гаспадаркі фармальна таксама лічацца за «Белрыбай», але большасьць іх — бесгаспадарчыя.

Нічога ня робяць Калгасцэнтр БССР і Белсельтрэст, каб аднавіць тыя прудавыя гаспадаркі, якія ёсьць у саўгасах і калгасах. Рыба, якая была ў сажалках саўгасаў і калгасаў, амаль уся вымерла.

Усё гэта гаворыць аб тым, што «Белрыба» пакуль што яшчэ ня здолела прывесьці ў парадак хаця-б тыя рыбныя гаспадаркі, якія ёсьць у БССР. Што-ж датычыць арганізацыі новых рыбаводных гаспадарак, дык у гэтым напрамку ніякіх практычных мер ня прынята. Ёсьць толькі намёчаньне арганізаваць у Менскай акрузе дзьво буйныя прудавыя гаспадаркі: адну на 3.000 гэкт. і другую — на 4.500 гэктараў.

Зусім зразумела, што «Белрыба» сама ня зможа справіцца з задачай пашырэньня рыбаводзтва. Зямельныя органы, хаця непасрэдных адносін да рыбных спраў зараз і ня маюць, аднак бяз іх удзелу «Белрыбе» ня справіцца з арганізацыяй буйных прудавых гаспадарак. Між тым, Наркамзем і яго органы на мясцох адмаўляюцца ад якойбы там ні было дапамогі, лічачы, што пытаньні разьвіцьця рыбаводзтва іх не датычаць.

А.

Вышэйшая дапрызыўная падрыхтоўка дасьць новыя кадры падрыхтаваных камандзіраў запасу

Увага ваеннай падрыхтоўцы ў ВНУ

З 1926 году ў вышэйшых навучальных установах Саюзу ўведзена вышэйшая дапрызыўная падрыхтоўка студэнтаў.

Падрыхтоўка праводзіцца ў працягу ўсяго курсу навучаньня. Яна складаецца з тэарэтычных заняткаў і асобнага лягернага збору студэнтаў, адзін раз за час навучаньня. Ад тэарэтычных заняткаў не вызваляецца ніхто са студэнтаў; ад практычных вызваляюцца жанчыны і тыя з мужчын, якія на стане свайго здароўя ня могуць служыць у войску.

Практыка работы на працягу мінулых 3-х год паказала, што ў вайсковай падрыхтоўцы студэнтаў прынятая ўстаноўка навучаньня сабе апраўдала. Мы маем рад лічбовых даных, якія ілюструюць рост і разьвіцьцё гэтае справы ва ўсіх нашых ВНУ. Ад далатку да асноўных праграм, як гэта мела месца спачатку, вайсковая падрыхтоўка робіцца там навучальным прадметам, які прасякае сабою ўсю праграму ВНУ. Вайсковы элемэнт уключаецца зараз ва ўсе акадэмічныя праграмы ВНУ. Ён ставіцца ў лік фактараў, якія вызначаюць сабою ўхіл акадэмічнай прапрацоўкі тае або іншае навуковае дысцыпліны.

Зараз заўважваецца пэўны пералом у адносінах студэнцтва да вышэйшай дапрызыўнай падрыхтоўкі. Калі спачатку былі выпадкі варожых адносін студэнцтва да гэтай падрыхтоўкі, дык зараз, наадварот, мы бачым у ВНУ цэлы рад вайсковых гурткоў, якія актыўна наведваюцца студэнцтвам.

Палітыка - маральны стан студэнцтва, асабліва на лягерных зборах, што год расьце і мацнее. Студэнцкія часьці зьяўляюцца ўзорам высокай дысцыпліванасьці, стараннасьці і добрасумленнасьці ў выкананьні ўсякай даручанай работы.

У вышэйшай дапрызыўнай падрыхтоўцы, якая праводзіцца ў ВНУ, зразумела, яшчэ ня ўсё здавальняюча. Ня ўсюды яшчэ абсталяваны, як належыць, вайсковыя габінэты; ня ўсюды добра падабраны выкладчыкі; расклад заняткаў дзе-ні-дзе складзены ня зусім здавальняюча. Усё гэта, зразумела, недахопы, але такія недахопы, якія лёгка можна ўнікнуць.

Да вышэйшай дапрызыўнай падрыхтоўцы трэба прыцягнуць увагу ня толькі студэнцтва ВНУ, але ўсёй савецкай грамадзкасьці. Такім чынам у хуткім часе мы зьнішчым у ёй тыя недахопы, якія там яшчэ маюць месца.

ПАДАРОЖНЫ.

Рэацтва у вайсковай падрыхтоўцы

Вайсковая падрыхтоўка ў БДУ за гэты два гады мае рад дасягненьняў. Але на фоне гэтых станоўчых бакоў ёсьць рад фактаў, якія алмоўна ўплываюць на справу пастаноўкі вайсковага навучаньня студэнтаў БДУ.

Асноўнае гэта тое, што т. Пятроў, кіраўнік вайсковай падрыхтоўкай БДУ слаба кіруе ёю.

Вынікам слабага кіраўніцтва зьяўляецца, напершае, невыстарчальная падрыхтаванасьць да заняткаў выкладчыкаў. Напрыклад, т. Раманаў, растлумачваючы розьніцу паміж палітыкіраўніком і камроты гаворыць, што: «Палітыкіраўнік ня мае дысцыплінаваных правоў да падлеглых камандзіраў, а выключна мае гэтыя правы да чырвонаармейцаў». Такое тлумачэньне зьяўляецца няправільным.

Здараецца, што той ці іншы выкладчык не зьявіўся на заняткі, у такім выпадку загадчык вайсковага габінэту БДУ т. Барздоў (які зьяўляецца выкладчыкам БДУ, студэнтам БДУ) замяшчае яго і лічыць, што ён «па вайсковых дысцыплінах заўсёды гатоў» і таму не рыхтуецца, аб'яднае некалькі груп у адну, за што атрымлівае плату.

Выкладчыкі навіны вечарам час ад часу наведваць БДУ, каб дапамагчы кансультацыяй і інш., але гэтага на справе ня бывае, пераважная большасьць выкладчыкаў мае такі погляд— дзьве гадзіны прайшлі і добра. Трэба больш сачыць і кіраваць у БДУ вайсковай падрыхтоўкай.

Д. Б.

Я. ЛІМАНОЎСКІ

Правядзем межы, акрэсьлім задачы *)

«Узвышша» яшчэ дагэтуль тлумачыць свой выхад з «Маладняка» тым, што нібыта ўзвышаўцы разышліся з маладнякоўцамі, галоўным чынам, на пытаньнях творчага мэтаду. Гэта, зразумела, няправільна таму, што ў прынцыповых поглядах «Узвышша» і тагочасьнага «Маладняка» на задачы літаратуры, былі больш сур'ёзныя разьбежнасьці. Далейшая праца і творчасьць «Узвышша» пацьвердзілі, што разыходзіны былі больш значныя, што разьмежаваньне адбывалася па сацыяльнай лініі. У чым гэтыя асноўныя разыходзіны? «Узвышша» замест творчасьці, якая павінна адгукацца на найбольш актуальныя праблемы сацыялістычнага будаўніцтва (гэтым яшчэ не абмяжоўваецца тэматыка пралетарскай літаратуры) высоўвала, як задачу, стварэньне літаратуры, якую ўбачаць вякі і народы». Захапленьне фармальна мастацкім бокам творчасьці, пры ня досыць пільнай увазе да зьместу. Адмаўленьне ўдзелу пісьменьніка ў культурна-грамадзкай працы, што азначае адрыў ад пралетарскіх мас — замыканьне ў рамках вузка-літаратурнай арганізацыі. Адсутнасьць самакрытыкі, залішне паблажлівыя адносіны да памылак сваіх сяброў па аб'яднаньні. Гэтыя абставіны пры ўмовах націску дробна-буржуазнай стыхіі, стварылі спрыяючую глебу для антыпралетарскіх ухілаў у творчасьці паасобных пісьменьнікаў з групы «Узвышша» і, наколькі на было па іх рэагаваньня,— для памылак усяго аб'яднаньня. Мы тут ня маем магчымасьці больш падрабязна разгледзець творчасьць паасобных пісьменьнікаў групы «Узвышша». Аднак, мусім сьцьвердзіць, што на сёньня група «Узвышша» ўжо таксама не зьяўляецца адзінай арганізацыяй, як гэта магло здавацца пры яе заснаваньні.

У. Дубоўка, ідучы па лініі фармальна-мастацкіх шуканьняў, удасканаленьня тэхнікі сваёй творчасьці (тут ён мае значныя дасягненьні), дайшоў да выразна нацыянал-дэмакратычных матываў. (У сымбалічных вобразах, напрыклад, паэмы «І пурпураных ветразей узьнімі»). Выразна-к

Беспартыйная рабочая канфэрэнцыя Кастрычніцкага раёну

4-га мая, а 7-й гадзіне веч. у клюбе мэталістых адкрылася беспартыйная рабочая канфэрэнцыя Кастрычніцкага раёну.

Канфэрэнцыяй выбрана дэлегацыя для прывітаньня пленуму акругкому КП(б)Б, які зараз праходзіць.

З вялікім дакладам аб міжнародным і ўнутраным становішчы і задачах рабочае клясы выступіў старшыня СНК БССР т. Галадзед. (Даклад т. Галадзеда будзе зьмешчаны заўтра).

Канфэрэнцыяй пасланы прывітальныя тэлеграмы ЦК КП(б)Б і ЦК УсеКП(б) наступнага зьместу:

«Рабочая канфэрэнцыя Кастрычніцкага раёну гораду Менску шле шчырае пралетарскае прывітаньне штабу сацыялістычнага будаўніцтва СССР і БССР—ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б. Рабочая канфэрэнцыя запэўняе ЦК ленінскай партыі, што рабочыя фабрык і заводаў Кастрычніцкага раёну з яшчэ большай энэргіяй і энтузіязмам будуць змагацца за выкананьне прамфінпляну, за ажыцьцяўленьне пяцігодкі ў 4 гады, за якасныя паказальнікі работы фабрык і заводаў, за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі ў культурным і гаспадарчым сацыялістычным будаўніцтве.

Няхай жыве ленінская партыя і яе цэнтральныя камітэты! Няхай жыве сацыялістычнае будаўніцтва СССР!»

Кулацкі лазутчык выкрыты

Пастанова партколегіі ЦКК КП(б)Б па справе Вечара

У свой час у «Зьвязьдзе» пісалася аб тым, што рэдактар часопісі «Шлях калектывізацыі» Вечар Алесь выкарыстоўваў сваё службовае становішча і партыйнасьць у сваіх асабістых мэтах. Вечар пры ўступленьні ў партыю ўтаіў сваё сацыяльнае паходжаньне. Бацькі яго заможныя гаспадары, займаліся эксплёатацыяй чужое працы. Вечар увесь час падтрымліваў са сваімі бацькамі-кулакамі сувязь. Ён раіў ім распродаць сваю гаспадарку, хадайнічаў за свайго брата, (які быў арыштаваны і высланы з межаў БССР за контр-рэвалюцыйную дзейнасьць), хадайнічаў за сваіх бацькоў, абкладзеных індывідуальным падаткам, падкрэсьліваючы сваё службовае становішча, як рэдактара часопісі «Шлях калектывізацыі» і сваю годнасьць члена партыі, на якога нібыта клясавыя ворагі наступаюць за дзейнасьць у друку.

Партколегія ЦКК КП(б)Б, разгледзеўшы справу Алеся Вечара, пастанавіла:

1. Вечара Алеся Сьцяпанавіча, як чужога, выпадкова трапіўшага ў партыю, утаіўшага пры ўступленьні ў партыю сваё сапраўднае сацыяльнае паходжаньне і скарыстаўшага сваё прабываньне ў КП(б)Б і службовае становішча, як адказнага працаўніка друку для актыўнае абароны кулацтва, у першую чаргу эксплёататарскай гаспадаркі маткі і антысавецкіх дзеяньняў сваіх братоў — выключыць з радоў КП(б)Б, зьняць з працы рэдактара часопісі «Шлях калектывізацыі» і іншых адказных пасад.

2. Лічыць патрэбным неадкладна выключыць з с.-г. акадэміі Вечара Янку, аб чым паведаміць адпаведным органам.

3. Даручыць Слуцкаму РК КП(б)Б праз адпаведныя органы прыняць меры да канчатковага выкрыцьця ўсіх кулацкіх і варожых элемэнтаў у Машчыцах (не дапускаючы пры гэтым перагібаў у адносінах звычайных серадняцкіх гаспадарак). Высьветліць вінаватых у недаабкладаньні на працягу многіх год, аж да апошняга часу, паасобных гаспадарак у Машчыцах (Вечароў, Бржазазоўскага Дм. і інш.).

Даручыць РК КП(б)Б канчаткова праверыць правільнасьць заяў адносна п'янкі, сябраваньня з кулакамі і злачынстваў (атрыманьне хабару) з боку старшыні Машчыцкага сельсавету тав. Калешкі.

Праверку правядзеньня ў жыцьцё гэтае пастановы ўскласьці на Бабруйскую АКК.

Пералому у ходзе сплаву няма

Не хапае 10.000 рабочых

Даныя аб ходзе сплаву лесаматар'яжаў у БССР на 1 мая паказваюць, што тэмп сплаву ўсё яшчэ не дасягнуў патрэбнай вышыні.

З ліку падвезеных да прыстаняй лесаматар'ялаў спушчана толькі 52,2 процантаў і адана на месцы 4,3 проц. Дроў сплаўлена 17,5 проц. і адана арганізацыям на месцах 6,6 проц. Такім чынам, да поўнага выкананьня пляну засталося сплавіць 43,5 проц. лесаматар'ялаў і 76 проц. дроў.

Асабліва адстаюць Барысаўскі і Магілеўскі раёны, якія ў пляне сплаву займаюць даволі вялікае месца. **Барысаўскі раён выканаў план сплаву на 1-га мая на 32 проц., Магілеўскі раён—на 40 проц.**

Ня гледзячы на неадпаразовыя сыгналы «Зьвязды» аб неабходнасьці забесьпячэньня сплаўное кампаніі патрэбнай колькасьцю рабочае сілы, у гэтай галіне ўсё яшчэ мала зроблена. На сёньняшні дзень **адчуваецца нястача рабочай сілы да 10.000 чалавек. У Барысаўскім раёне патрабуецца 2.500 чалавек, у Магілеўскім 1.500 чалавек, у Мазырскім—звыш тысячы і г. д.**

Вярбовачны апарат у радзе раёнаў працуе невыстарчальна. Упоўнаважаны [illegible] ам. Мы ма[illegible] падстаўы заявіць, што наша ра[illegible]ная арганізацыя ўзброена для бо[illegible]бы на два фронты [illegible] галоў[illegible] на вярбоўцы ў Магілеўскай акрузе за ўвесь час сплаўной кампаніі ня выехаў на месца.

Вельмі мала ўвагі аддаюць сплаўной кампаніі райвыканкомы. **Бялынкаўскі і Чачавіцкі** райвыканкомы (Магілеўская акруга), напрыклад, да гэтага часу ня выручылі адказных за сплаў асоб. Наглядаюцца вышадкі рвацтва з боку плытагонаў. **У Запольскім сельсавеце,** Бялынкаўскага раёну на сходзе па вярбоўцы плытагонаў **камсамолец сарваў вярбоўку, заявіўшы:** «Мы па вашых распэнках працаваць ня пойдзем» Мясцовыя арганізацыі не вядуць дастатковай растлумачальнай работы сярод плытагонаў.

Спажывецкая каапэрацыя ня прымае мер **да забесьпячэньня плытагонаў патрэбнымі прадуктамі.** Да гэтага часу забесьпячэньне прадуктамі не наладжана. Старшыня **Чачавіцкага спажывецкага т-ва Агеенка** проста высьмеяў прадстаўніка Лесбелу, які патрабаваў выдачы плытагонам прадуктаў. Чэрыкаўскае спажывецкае т-ва на працягу цэлага тыдня ўпарта не жадала адпусьціць для плытагонаў неабходных прамтавараў. Усё гэта тармозіць нарматы ход [illegible] нацыянал-дэмакратызмам і шавінізмамі, перайшоў да пытаньня аб тэарытычнай [illegible]

С. Г.

Экскурсійнае бюро на паперы

Два з паловай месяцы назад пры цэнтральным інстытуце працы было арганізавана **экскурсійнае бюро,** у задачы якога ўваходзіла **арганізаваць сустрэчу экскурсантаў на першую ўсебеларускую с.-г. выстаўку.** Але гэтае экскурсійнае бюро да апошняга часу не разгарнула сваёй дзейнасьці. Яно ня склікала яшчэ ні аднаго пасяджэньня.

Старшыня экскурсійнага бюро тав. Рычкоў зараз адмовіўся ад работы ў бюро, матывуючы сваю адмову перагружанасьцю. Бязьдзейнічаюць таксама і члены бюро **Сьцепанюк і Мятліцкі,** якія ніякага капкрэтнага ўдзелу ў рабоце экскурсійнага бюро ня прымалі. Між тым, праз сельскагаспад. выстаўку мяркуецца прапусьціць каля 50.000 экскурсантаў. На выстаўку прыедзе шмат рабочых і сялян, якія патрабуюць культурнага абслугоўваньня.

Вось чаму трэба неадкладна разгарнуць работу экскурсійнага бюро, на якое ўскладзена культурна - эканамічнае абслугоўваньне наведвальнікаў выстаўкі.

Б. З.

ВЕЧАР ДРУКУ

ЦП саюзу друкароў і бюро сэкцыі працаўнікоў друку арганізуюць 6 мая

вечар працаўнікоў друку, рабочых друкарань сумесна з рабкорамі

ПАРАДАК ВЕЧАРУ: 1. Друк пад агонь бальшавіцкай самакрытыкі (уступна слова т. Будзінскага, выступленьні прадстаўнікоў рэдакцыі і рабкораў. Пасьля—сьветавая газэта і вялікі канцэрт. Пачатак а 8 гадзіне.

ЦП саюзу друкароў і ЦБ сэкцыі працаўнікоў друку.

Гадавіна забойства т. Варавы

4-га мая 1929 году, напярэдадні дня друку, контр - рэвалюцыянэр Насута, натхнёны Парсаковым, Вэнэдыктавым і інш. забіў рэдактара насьценнай газэты «Зямельны Працаўнік». Стрэл Насуты быў стрэлам клясавага ворага супроць пралетарскай самакрытыкі, супроць пралетарскага друку. Забіты т. Варава вёў актыўную барацьбу са шкоднікамі, п'яніцамі і нядбалымі, выкрываў усе іх злачынныя ўчынкі.

Пралетарскі суд жорстка пакараў забойцу.

На вымену Вараве ідуць сотні і тысячы новых, адданых справе сацыялізму пралетараў.

У гадавіну забойства Варавы сьценкоры насьценгазэты «Зямельны Працаўнік», працаўнікі акраэ яшчэ шчыльней павінны згуртавацца наўкола сваёй газэты і, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, весьці рашучую барацьбу з усякімі нездаровымі зьявішчамі як у сваёй установе, так і па-за яе сьценамі. Гэта будзе лепшым вянком на магілу т. Варавы.

Праўленцы калгасу „Чырвоны Агароднік" разваліваюць калгас

У Менску арганізован татарскі агародны калгас «Чырвоны Агароднік», які займае каля 70 гэкт. зямлі і мае звыш 1.000 рам парнікоў. Гэты калгас мае практычны вытворчы вопыт. У калгас уступіла 98 сем'яў з 160 працаздольнымі работнікамі.

Татарскія агароды, на якіх арганізаваны калгас, зьяўляліся адзнай з важных баз па забесьпячэньні Менску гародзінай. Аб калектывізацыі гэтых агародаў пісала газэта «Зьвязда» яшчэ ў 1926 годзе.

Як-жа разгарнуў сваю работу новаарганізаваны калгас Трэба адзначыць, што **сярод калгасьнікаў не вядзецца кіпкай культурна-асьветнай работы..** Кіраўніцтва гэтым калгасам знаходзіцца не на вышыні. Старшыня праўленьня калгасу не на сваім месцы. Ён аўтарытэтам сярод калгасьнікаў не карыстаецца і не праяўляе ініцыятывы ў рабоце. **У сваёй рабоце ён заўсёды высоўвае на першае месца свае асабістыя інтарэсы, забраў сабе пад кватэру пры парнікох калгасны дом. Праўленьне калгасу за гарэлку вызваляе некаторых членаў калгасу ад работы, калгасныя коні адпускаюцца для работы на [illegible] памылкі, зьвязаныя з памылкамі Бука[illegible] ня. Пра ўсе гэтыя непарадкі справа знаходзіцца ў РСІ.**

Работа ў агародах пастаўлена дрэнна. Ужо пасьпяваюць раньнія гуркі, але яны зарасьлі лебядою. Грамадзкае харчаваньне калгасьнікаў таксама пастаўлена дрэнна. Абедаюць 25 калгасьнікаў у малюсенькім памяшканьні плошчай у 18 кв. аршын у той час, як тут побач старшыня калгасу **Джынаевіч,** маласямейны, займае калгасны дом з 4 вялікіх пакояў з кухняй.

Самакрытыкі ў рабоце няма. **Калгасьнікі баяцца выступаць з крытыкай недахопаў у рабоце членаў праўленьня калгасу.**

Калгасу дапамагае толькі лёгкая кавалерыя, якая дабілася, каб калгасьнікі ўступілі пайшчыкамі ў каапэратыў. Паводле прапановы лёгкай кавалерыі адкрыт дзіцячы дом.

Для забесьпячэньня нармальнае работы ў татарскім агародным калгасе **трэба зараз-жа перавыбраць праўленьне калгасу, якое на чале з старшынёй Джынаевічам не адпавядае свайму прызначэньню.** Гэтае мерапрыемства аздаровіць усё жыцьцё і работу калгасу. РСІ — дапамажы.

ДЗЯДЗЬКА А.

МЕНСК

Адкрыцьцё дому адпачынку ў Ждановічах

15-га мая ў Ждановічах адкрываецца летні дом адпачынку. Усе месцы ўжо разьмеркаваны. Для барысаўскіх рабочых вызначана 70 месц. Дом адпачынку сёлета значна пашыраны. Пры ім будзе іскаваць сталоўка на 500 чалавек, аправа таго пабудаваны інтэрнат для абслугоўваючага пэрсаналу на 70 чалавек, мэханізаваная пральня і электрастанцыя. Будуецца клюб на 1.000 чалавек. Дом адпачынку будуць абслугоўваць тры дактары, інструктар і культарганізатар.

Пленум ЦП саюзу дрэваапрацоўшчыкаў

12-га мая ЦП саюзу дрэваапрацоўшчыкаў склікае пашыраны пленум саюзу, які адбудзецца ў **Бабруйску на дрэваапрацоўчым камбінаце.**

На пленуме будуць абгавораны наступныя пытаньні: аб выкананьні прамфінпляну, сапсабарніцтве і ўдарніцтве, аб выніках работы на правядзеньні пасеўнай кампаніі на вёсцы (справаздачы брыгад). У рабоце пленуму будуць прымаць удзел дырэктары буйных дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў.

***

15-га чэрвеня ў Менску адкрываецца паўтарамесячныя цэнтральныя ўсебеларускія курсы па падрыхтоўцы інструктароў фізкультуры для прафгурткоў калгасаў і саўгасаў. Курсы арганізоўваюць ВСФК і ЦСПСБ. На курсы будзе прынята 60 чалавек, з якіх 35 рабочых, 15 калгасьнікаў і саўгасьнікаў і 10 служачых.

***

Гэтымі днямі пры мясцкоме Абкамтрэсту адкрываецца дзіцячыя ясьлі на 20 чалавек. На ўтрыманьне ясьляй адпушчана 5.000 руб.

***

У канцы чэрвеня месяца Менскі акрінспэктарыят асьветы адкрывае курсы па павышэньні кваліфікацыі настаўнікаў 4-хгадовых вясковых, калгасных і саўгасных школ. Курсы разьлічаны на 100 чалавек. Тэрмін навучаньня на курсах паўтара месяцы.

***

10-га мая ЦСПСБ склікае ў Менску міжсаюзную нараду фізкультурнага актыву, на якой будуць заслуханы даклады аб праверцы ўдзелу фізкультурнікаў на ўдарных брыгадах, аб выкананьні прамфінпляну і аб летніх формах гурткоўай і масавай фізкультурнай працы ў горадзе.

***

У Менску адкрываюцца вячэрнія міжсаюзныя курсы па падрыхтоўцы кіраўнікоў масавымі фізкультурнымі заняткамі на прадпрыемствах. Курсы разьлічаны на 75 чалавек.

***

У канцы мая ў Менску адбудзецца гарадзкі зьлёт фізкультурнікаў, на якім будуць падагулены вынікі ўдзелу фізкультурнікаў у рабоце ўдарных брыгад і ў выкананьні прамфінпляну.

Камсамольцы, на прагляд першае пастаноўкі ТРАМ'у!

Мен. АК ЛКСМБ і рэдакцыя газэты «Чырвоная Зьмена» наладжваюць грамадзкім камандаваньнем аб дапамозе [illegible] прагляд і абгаварэньне першае пастаноўкі-спэктаклю беларускага тэатру рабочае моладзі «Першы Штандар» у двух частках.

Прагляд адбудзецца 7-га мая ў 19 гадз. у памяшканьні пятнага тэатру саду «Прафінтэрн».

Білеты ў райкомах ЛКСМБ і рэдакцыі газэты «Чырвоная Зьмена».

АДПУСКНІКІ!

ВАМ БУДЗЕ ПАСЫЛАЦЦА газэта „ЗЬВЯЗДА" па месцы знаходжаньня ў водпуску без асобнай даплаты.

Незабудзьцеся паведаміць у к-ру газэты «Зьвязда»

ВАШ НОВЫ АДРАС.

З лістоў рабселькораў

ФАРМАЗАВОД НАБЫВАЕ СТАРОЕ АБСТАЛЯВАНЬНЕ

Адміністрацыя фармазаводу (Менск) пабыла ў прыватніка Эдэльмана стары шыкінарны завод, на што патрачана некалькі тысяч рублёў. Для ўстаноўкі машын шыкінарнага заводу ўзят на год прыватнік заводу для яго пуску. Хутка скончыцца год, а адміністрацыя не клапоціцца падрыхтаваць спэцыялістага па шыкінарнай справе. Больш таго, гэты прыватнік часта «хварэе», а завод стаіць на замку.

Для вырабу скрыначак дырэктар заводу набывае ў прыватніка «пазбаўленца» скрыначнай майстэрні старыя варштаты і машыны, не ўгадкіўшы гэтага пытаньня з вытворчай камісіяй. РСІ павінна гэтым пытаньнем зацікавіцца.

БЕЛІНА.

УДАРНІКІ НА ПАПЕРЫ

З Віцебскага фанэрнага заводу за невыкананьне прамфінпляну зьнята назва — ударны. Пасьля гэтага па цэхах пачала праводзіцца работа, пачалі зноў арганізоўвацца ўдарныя брыгады. Калі прыледзецца да гэтых ударнікаў, дык на 50 проц. яны зьяўляюцца ня ўдарнікамі, а ілжэ-ўдарнікамі. Да ліку такіх «ударнікаў» адносяцца нават некаторыя камуністыя і камсамольцы. Так, член партыі Палянціна, камсамолка Калмановіч і работніца Нікіціна ўзялі на сябе такія абавязкі: «тавар укладаць на таўшчыні, выпускаць добрай якасьці прадукцыю, зьнішчыць прагулы і г. д.». Але гэтыя «ўдарнікі» ў сваёй заяве заводакіраўніцтву пішуць: «вызнальце ад адвозкі фанэры ў цыркуляранае аддзяленьне, бо гэта могуць рабіць самі цыркуляршчыкі». Такія заявы ня рэдкія. Частка камуністых і камсамольцаў цягнецца ў хвасьце ўдарніцтва. Гэта ў той час, калі парт'ячэйка абвясьціла сябе ўдарнай.

Вакол сапсаборніцтва і ўдарніцтва неабходна мабілізаваць увагу рабочае масы, а партыйцы павінны быць на справе пачынальнікамі ўдарніцтва.

Н. Д.

МАШЫНЫ ІРЖАВЕЮЦЬ

На дварэ Копыйскага с.-г. крэдытнага таварыства (Аршаншчына) валяюцца с.-г. машыны. Гэтыя машыны валяліся цэлую зіму пад сьнегам і дажджом, іржавелі, а праўленьне таварыства ня прымала ніякіх мер для пабудовы якойнебудзь паветкі. Ня так даўно прывезлі партыю арфаў і таксама паставілі іх на дажджы. Сялянства абурана такой безгаспадарчасьцю.

РАБКОР Н.

ХТО ВІНАВАТЫ?

У краме МЦРК па Гарбарнай вуліцы (Менск) было разьбіта вялікае вакно. Кавалкі шкла, таўшчынёю ў 10 мм. маглі пайсьці на што-небудзь карыснае.

Белпаляводсаюзу такое шкло вельмі патрэбна было, але МЦРК адмовіўся яго прадаць. Урэшце, шкло праляжала нейкі час і было набіта на дробныя кавалкі, што прынесла некаторыя страты.

Хто ў гэтым вінаваты?

КАВАЛЬ.

ШКОДНАЯ РАБОТА

У Вярэйнскім раёне (Меншчына) некаторыя работнікі не ўявілі сабе добраахвотнасьці калгаснага будаўніцтва. Так, каапэратар Булайчык Р. з вёскі Капланец распускае такія шкодныя чуткі: «Дзядзькі, уступайце ў калгас, бо хутка возьмемся зноў раскулачваць». Такая [illegible] шкодная работа не дапамагае калгаснаму будаўніцтву, а наадварот, шкодзіць. З гэтым трэба змагацца.

ЗОРКІ.

ЗАКРАНУЛІ СЕРАДНЯКА

Недапушчальнае галавацяпства і скажэньне клясавай лініі было дапушчана парт'ячэйкай і Нацкім сельсаветам, Ветрынскага раёну (Полаччына) пры правядзеньні раскулачваньня. Мясцовыя работнікі на чале з сакратаром ячэйкі Кавалёўскім пры правядзеньні работы па раскулачваньні не апіраліся на батрацка-бядняцкія групы, не растлумачвалі значэньня ліквідацыі кулацтва, як клясы, а займаліся голым адміністраваньнем. У выніку ўсяго гэтага дапушчан цэлы перагібаў у адносінах да серадняка і інш. палітычныя памылкі.

Частка раскулачанае маемасьці кулакоў замест перадачы ў калгас падзялялася паміж тымі, хто прымаў удзел у раскулачваньні.

ВОКА.

***

У Плешчаніцкім раёне пры раскулачваньні зроблены цэлы рад перагібаў. Пад раскулачваньнем трапіла некалькі серадняцкіх, якім потым прыходзілася варочаць іх маемасьць. Але многіх рэчаў зараз не хапае, і сельсавет ня ведае, з каго іх спагнаць.

Р.

Мопраўская ўдзячнасьць

Менскі акруговы камітэт МОПР'у са здавальненьнем адзначае вялікі посьпех праведзенага дня «Чырвонай кветкі» па г. Менску і 1 і 2 мая, што дало **4.800 рублёў на карысьць палітзьняволеных і іх сем'яў.**

Гэтыя посьпехі сьведчаць яшчэ раз аб вялікай сьвядомасьці, чуласьці і актыўнасьці працоўных г. Менску, якія выканалі свой абавязак да сусьветных барацьбітоў рэвалюцыі ў дзень 1 мая.

Працоўныя г. Менску з радасьцю несьлі насустрач свае капейкі ў фонд дапамогі ахвярам фашызму.

Трэба асабліва канстатаваць нябывалую актыўнасьць усіх ячэек МОПР'у г. Менску, жаночага актыву ЖАКТ'аў, саматужнікаў, пралетарскага студэнцтва да ўдзелу ў мопраўскім карнавале і скарбоначным зборы. Усяго [illegible] ўдзел у карнавале і скарбоначны збор больш 1.000 чал. З усіх раёнаў Менскай акругі даходзяць весткі аб пасьпяховым правядзеньні дня «Чырвонай кветкі», што, бязумоўна, яшчэ пару тысяч рублёў на карысьць МОПР'у.

Менскі акруговы камітэт МОПР'у прносіць мопраўскую ўдзячнасьць працоўнаму насельніцтву і грамадзянам г. Менску за актыўны ўдзел і дапамогу барацьбітом рэвалюцыі і іх сем'ям.

МенАК МОПР'у заклікае і далей усіх працоўных згуртавацца вакол МОПР'у і даказаць сваю здольнасьць на ажыцьцяўленьні ідэі міжнароднага пралетарскай салідарнасьці.

Старшыня МенАК МОПР'у ЦУ[illegible]ІН.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

14-га мая склікаецца акруговая нарада культпропаў з наступнымі дакладамі дня:

1. Задачы прапаганды марксызму-ленінізму ў сувязі з чарговымі задачамі партыі (дакл. т. Камянштэйн).

2. Вынікі партасьветы ў акрузе за 1929-30 навучальны год (дакл. т. Гарэлік).

3. Аб сыстэме масавай партасьветы ў горадзе і ў вёсцы на 1930-31 навуч. год (дакл. т. Орліс), судаклад АК ЛКСМБ (дакл. т. Рубінчык).

4. Аб сыстэме тэарэтычнай вучобы актыву на 1930-31 г. (дакл. т. Модэль).

На нараду выклікаюцца загадчыкі АПА і культпропаў РК, ра[illegible] прапагандыстыя, заг. АПА РК ЛКСМБ па горадзе і раёне.

Нарада працягнецца тры дні.

АД ЦКК КП(б)Б

На пасяджэньні партпройкі ЦКК КП(б)Б 13 мая ў 18½ гадз. будуць разглядацца справы наступных т. т. Данейкі Сьцяпана Міхаёва, Гельфанда Абрама Гіршавіча, Коршака Сьцяпана Васільевіча, Сілкіна Тодара Мартынавіча, Ганжурава Платона Трафімавіча, Пакроўскага Ізмаіла Гаўрылавіча, Мельніка Шолама Гершковіча, Цільке Мікалая Альбэртавіча, Шлыка Віктара Сьцяпанавіча, Дрэздоўскага Мікалая Янкавіча, Ваксмана Мацея Рыгоравіча, Кліпцана Мэера Майсеевіча, Саламенкі Сьцяпана Алексеевіча, Труша Лявона Пятровіча, Уласэвіча Сьцяпана Пілінавіча, Гаварцова Сьцяпана Пілінавіча, Бусловіча Майсея Мордуховіча, Брухмана Льва Аркадзьевіча, Ляховіча Алеся Сьцяпанавіча, Плятнёва Мікалая Васільевіча, Мезіна Дамеціка Генрыхавіча, Паўлаўца Мікалая Іванавіча, Ляха Зьмітра Карпавіча, Барштэйна Файбэля Шмуйлавіча і Нісьневіча Гдалі Мееравіча.

Усе гэтыя таварышы запрашаюцца прыняць удзел пры разглядзе іх спраў. Таксама запрашаюцца старшыні праверкомаў, дзе гэтыя таварышы праходзілі чыстку і сакратары тых ячэек, дзе яны пічацца на вучоце, і знаходзяцца ў Менску.

СЁНЬНЯ

Клюб навуковых працаўнікоў. У 20½ гадз.—лекцыя **тав. Выдры** «Дыялектыка грамадзкага працэсу».

БДУ (Хэмфак, хэмкорпус). Адкрыты сход ячэйкі КП(б)Б, пач. у 19 гадз.

Пасядж. прэзыдыуму цэнтральнага савету СВБ БССР у 19 гадз. у гасцінным наркома асьветы (Пляц Волі). Яўка членаў савету СВБ абавязкова.

АК МОПР'у. Пасяджэньне камфракцыі Мен. АК МОПР'у. Пач. у 18 гадз. Яўка членаў і канд. АК—партыйцаў, членаў фракцыі Фр. і Кастр. РК МОПР'у абавязкова. Запрашаюцца актывісты і партыйцы гарадзкіх ячэек МОПР'у.

ЗАЎТРА

Пасяджэньне жан. сэкцыі Кастрычніцкага РК МОПР'у. Пач. у 19 гадз. Прысутнасьць усіх дэлегатак абавязкова. Запраш. жактаўскі актыў.

ПАСЬЛЯЗАЎТРА

Дэкадны камвуз. Заняткі на агарнічным курсе ў 18 гадз. на тэму «Асноўныя праблемы савецкай аграмікі». Лектар—**Аксэльрод.**

Вячэрняя саўпартшкола. Заняткі на першым курсе па палітэканоміі, на другім—па эканомпалітыцы. Яўка усіх хачоў і выкладчыкаў—абавязкова.

ПАПРАЎКА

У артыкуле «Нашы задачы» («Зьвязда» № 103 ад 5-V, 1-ая калёнка, [illegible] абзац, 6-ты радок) выпала некалькі [illegible] э пачатку фразы, узятае ў дужкі (я[illegible] гэта думаюць і г. д.)». Поўны-ж [illegible] у дужках павінен быў быць [illegible] «(блізкасьці—у сэнсе заваяваньня [illegible] моніі ўжо па працягу бягучага год [illegible] гэта думаюц...») і г. д.

Адказны рэдактар Ян. АСЬМО

РАБОЧЫ КЛЮБ

Нова-Барысаў

7 мая

Культпроп Барысаўскага РК КП(б)

СКЛІКАЕ

на 7 мая, а 7 гадз. увеч.

агульны сход РАБОЧЫХ 4-х ПРАДПРЫЕМСТВАЎ!

ПАРАДАК ДНЯ:

1. Даклад аб дні друку і рабоце газэты «Зьвязда».

Для дакладу прыяжджае прадстаўнік рэдакцыі «Зьвязда»

Культпроп РК КП(б)Б

КАСТРЫЧНІЦКІ РАЙКОМ КП(б)Б

склікае 6 мая, а 7 гадзіне ўвечары

НАРАДУ ўпоўнаважаных па „ЗЬВЯЗЬДЗЕ"

Упоўнаважаныя ад партыйных і іншых сходаў у дзень нарады **ВЫЗВАЛЯЮЦЦА**

Нарада адбудзецца у памяшканьні райкому

Райком КП(б)Б

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР

Сёньня, 6 мая

РАЗЬВІТАЛЬНЫ КАНЦЭРТ дзяржаўнага КВАРТЭТУ ІМЯ ВІЛЬОМА

У праграме: **Чайкоўскі, Барадзін, Равель, Казіцкі, Фаменка.**

Пачатак а 8 з пал. гадз.

Білеты ў касе тэатру і у Рабкасе.

КІНО-ТЭАТР КУЛЬТУРА

Выключнае выканаўніцтва дэманстраванае музычнага інструменту **„БАТЫШЧ-ТОН"**, які зьмяняе аркестр. Выканаўцы А. Г. і О. В. **ТУЛЬСКІЯ БАТЫШЧАВЫ** пры ўдзеле артыстых „МЮЗІК-ХОЛ". На экране **ЛЮЛЬКА КАМУНАРА** у 6 част

Пачатак: 7 г., 8 г. 30 м., 10 г. 15 м. Каса—ад 5 г. дня.

КІНО Інтэрнацыянал

Замежны мастацкі фільм **Чалавек, які сьмяецца** па раману **Віктара Гюга.** У галоўнай ролі **Конрад Вэйдт.**

Пачатак 1-га сэансу а 7 гадз. увечары. Каса ад 5 гадз.

КІНО Пралетары

ЗАМЕЖНЫ ФІЛЬМ НУРЫ кіно-п'еса ў 6 частках.

Пачатак 1 сэансу а 7 г. Каса адкрыта ад 5 гадз.

1-шы дзіцячы кіно-тэатр „Юны Піянэр"

2 фільмы ў адзін сэанс 2

1) культурфільм **АЛТАЙ КІЖЫ** ў 5-ці частках

2) замежная камэдыя **ЦІХАЯ СЯМЕЙКА** ў 2 часты,

Пачатак 1-га сэансу а 2 г. Каса адкрыта ад 12 гадз.

КІНО СПАРТАК

Мастацкі спартыўны фільм з цыклю «ЧЭМПІЁН СЬВЕТУ»

11 ЧАРЦЕЙ

У галоўных ролях вядомыя кіно-артысты ЛЮСІ АРНО і ГУСТАЎ ФРЭНІХ. Пачатак а 7 г., 9 г. і 10 г. 45 м. Каса—ад 5 г. 30м.

КААПЭРАЦЫЙНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ І ПРАЦАЎНІКІ

ПАДПІСВАЙЦЕСЯ НА СВАЮ АДЗІНУЮ ЎСЕБЕЛАРУСКУЮ ІЛЮСТРАВАНУЮ КААПЭРАЦЫЙНУЮ **ЧАСОПІСЬ**

„КААПЭРАЦЫЯ БССР"

Вышла з друку і дасылаецца падпісчыкам часопісь

№1-2 „КААПЭРАЦЫЯ БССР" №1-2

З красавіка месяца часопісь рэарганізавана і разьлічана на шырокага нізавога чытача.

Часопісь выходзіць ілюстраванай 1 раз у 20 дзён. | Просьба ўсіх каапэрацыйных працаўнікоў пісаць у сваю часопісь. | Падпісная цана ЗЬНІЖАНА.

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА,

на 2 месяцы . . 60 кап. | на 6 месяцаў . . 2 рублі.

на 4 месяцы . . 1 р. 10 кап. | на год . . . . 3 р. 75 кап.

Асобны экзэмпляр—25 кап.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ўсімі паштовымі аддзяленьнямі, агентамі БДВ, лістаносамі і непасрэдна ў рэдакцыі: г. Менск, Савецкая, 43, Белкаапсаюз, рэдакцыі часопісі «КААПЭРАЦЫЯ БССР».

ЗГУБЛЕНУЮ круглую пячатку Шацкага спажывецкага таварыства лічыць несапраўднай.

ШУКАЮ Агафію Сідараву Юбко, якая прапала 2 сакавіка са ст. Коханаве. Асоб, якія ведаюць яе месцазнаходжаньне прашу паведаміць па адрасе: пошта Ухвала, Аршанск. акругі, вёска Матошні, Крупскага раёну, Сідару Юбко.

БУХГАЛТЕРІЮ общую и специальную, коммерческие вычисления также **«КОПИРУЧЕТ»** **ПРЕПОДАЮ** Замковая, 14, кв. 1. Дома с 5 часов вечера.

Для здачы **АБВЕСТКІ** у газэту **„ЗЬВЯЗДА"** звяраецца па тэл. **7-81**

У ВЫПАДКУ НЕАКУРАТНАЙ дастаўкі газэты **„ЗЬВЯЗДА"** звяраецца па тэл. **2-49**

50 К. кошт публікацыі аб згубе дакумента

Прыймо абвестак у чарговы нумар газэты да 2 гадзіны дня

Да ведама студэнтаў завочнага рабфаку

Дэканат Менскага Завочнага Рабфаку даводзіць да ведама студэнтаў, што з 20 ПА 25 МАЯ г. г. адбудзецца

праверка ведаў студэнтаў рабфаку і канфэрэнцыя з акадэмічна адстапымі таварышамі

Для атрыманьня літару з 50 проц. скідкай па чыгунцы, усім студэнтам да вызначанага тэрміну неабходна паведаміць рабфак аб прыезьдзе на канфэрэнцыю або іспыты. Адначасова паведаміць чыгуначную станцыю з якой патрэбна выяжджаць, (палустанак і разьезд вызначыць ня трэба).

Нам. дэкана рабфаку ЯКАЎЛЕЎ

ЛЯЧЭБНІЦА — МЕНСКАГА КАМІТЭТУ ГАРАДЗКОГА — ЎЗЕМАДАПАМОГІ

Ленінская, № 25, побач з 2-м Домам Саветаў, тэл. 12-66

АДКРЫТА ад 9 гадз. рэн. да 9 г. увеч

Прыём хворых па ўсіх спэцыяльнасьцях:

па ўнутраных, хірургічных, жаночых, вочных, хваробах вуха, горла і носа, скурана-венэрычных, страўніцкіх, нервовых.

Электра-сьвета-лячэньне і кварц адкрыты з 11—2 гадз. дня і 5—8 гадз. увеч.

Рэнтген (здымкі, прасьвечаньні, лячэньне) адкрыт з 4 г 30 м. да 9 г. увеч.

Прыём хэміка-бактэрыялёгічных аналізаў. Аптэка.

ЗУБНЫ ГАБІНЭТ адкрыт з 9 г. раніцы да 9 г. увеч. штодзенна

Кансультацыя прафэсароў па ўсіх спэцыяльнасьцях па папярэднім запісе.

Урачэбная дапамога на дому па ўсіх спэцыяльнасьцях. Запісь з 9 гадз. раніцы да 2 гадз. дня.

Дзежурства дактароў з 2 гадз. дня да 9 гадз. увеч.

Начное дзежурства дактароў ад 9 гадз. увеч. да 7 гадз раніцы.

Прыём хворых па лекавых кніжках камітэту Для ўсіх іншых грамадзян за агульна-даступную дыфэрэнцыяваную плату.

Мяняю комн. 15 кв. м. солн. стор., 2-й эт., паров. отопл., центр. р-н в Ленинграде на Минск—квартиру или 2 комн. не мен. 20 кв. м., район безразличен. Справ. от 12 до 16 час. 1 сов. гост. № 58 Пекурин.

Згубленыя і ўкрадзеныя

наступныя дакуманты лічыць несапраўднымі:

Вайск. біл. Губарэвіча А. А., выданы б. Паўлаўск. вол. за № 4561 225

Вуч.-конск. кн, Цьвяткова Ф. А 226

Вайск. біл. Макарына Ц., выд. Пухавіцкім РВК 227

Віза № 196 Клюя Д. П., выд. Новадворскім с/с. 228